Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ВЕРАСНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 186 (28044) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Ці выжывуць зубры?**

СТАР. 7

**Прыцягненне Шаўковага шляху**

СТАР. 11

**Гісторыя гродзенскай кірхі**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

## Больш за 200

*электронных адукацыйных рэсурсаў для настаўнікаў і школьнікаў распрацавана ў краіне. Яны ўключаюць навучальныя курсы, адпаведныя зместу праграм па вучэбных прадметах і ўзроставым пазнавальным магчымасцям вучняў. Гэтыя рэсурсы могуць выкарыстоўвацца ва ўстановах дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, у сістэме выхавання асобы, ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку педагагічных кадраў для агульнай сярэдняй адукацыі, ва ўстановах дадатковай адукацыі педагагічных работнікаў рэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўняў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17691,00 | ▼ |
| Еўра | 19776,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,14 | ▲ |
| Укр. грыўня | 820,36 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X



Фота БЕЛТА.

# КОЖНЫ НАРОД, КОЖНАЯ КРАІНА МАЕ ПРАВА НА ВЫБАР СВАЙГО ШЛЯХУ РАЗВІЦЦЯ

## Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на пленарным пасяджэнні саміту ААН па ўстойлівым развіцці

Паважаны спадар Старшыня!

Дамы і спадары!

Устойлівае развіццё любой краіны немагчыма без міру і бяспекі. Гэту бясспрэчную ісціну беларускі народ спаўна пазнаў на сваім лёсе. У мінулым стагоддзі Беларусь стала месцам самых кровапралітных бітваў дзвюх сусветных войнаў.

Таму мы надаём асаблівае значэнне прадухіленню ваенных канфліктаў і пагрозы жыццю людзей.

Страціўшы ў вайне з фашызмам трэць насельніцтва, Беларусь адрадзілася з попелу і свята шануе мір і згоду ў грамадстве, імкнецца забяспечыць дабрабыт народа і стабільнае развіццё дзяржавы.

За гады суверэннага існавання наша краіна з гонарам выканала тыя мэты тысячагоддзя, якія звязаны з ліквідацыяй голаду і беднасці, з дасягненнем стапрацэнтнай пісьменнасці насельніцтва, роўнасці мужчын і жанчын, сацыяльна-палітычнай стабільнасці, з недапушчэннем дыскрымінацыі па нацыянальных, рэлігійных прыкметах. У нас няма мацярынскай смяротнасці, дзіцячая смяротнасць — самая нізкая ў свеце. Менавіта гэта і ёсць дэмакратыя, а не тое, што спрабуюць насадзіць нам нашы заходнія настаўнікі.

На жаль, гэтага нельга сказаць пра нашу планету ў цэлым. Свет прыйшоў да саміту, на жаль, раз'яднаным, падзеленым, як ніколі раней за апошнія тры дзесяцігоддзі. Планету ўскалыхваюць шматлікія ўзброеныя канфлікты, тэрарыстычныя акты. Сумна тое, што рост глабальных пагроз не знаходзіць адэкватнага адказу.

Нам да гэтага часу не ўдалося аднавіць той баланс сіл, які быў страчаны з распадам Савецкага Саюза. Няма балансу сіл — няма міру і няма стабільнасці. Гэта сістэмны крызіс. У любой сістэме сіла, калі яна з'яўляецца адзінай, дзейнічае бескантрольна, імкнецца толькі да свайго працвітання і вырашэння праблем за кошт іншых.

Палітыка гегеманізму, нацыянальнага эгаізму прыводзіць да шырокага выкарыстання націску, санкцый, абмежаванняў і ваенных акцый. Як вынік — мы страчваем давер адзін да аднаго.

Прыклад адкрытага палітычнага хамства, хлусні і злачынстваў супраць чалавечнасці на паверхні. Давайце ўспомнім нядаўнія факты. Пад выглядам наяўнасці ядзернай зброі ў Іраку вядомыя дзяржавы вырашылі дэмакратызаваць Ірак. І дзе гэта ядзерная зброя? Дзе дэмакратыя ў Іраку? Навошта забілі прэзідэнта Ірака? Дзе наогул тая краіна і якая будучыня іракскага народа? На тэрыторыі гэтай дзяржавы стала людзям жыць лепш? Не.

Вы, вінаватыя, скажаце, што памыліліся, трэба спыніцца б. Але зноў жа — не, пайшлі далей. Пачалі з Туніса і скончылі Лівіяй. Сцэнарый той жа. Распялі прэзідэнта Кадафі, знішчыўшы дзяржаву. У Лівіі стала лепш? Не. І дзе гэтая Лівія наогул як цэласная дзяржава? Спадары, можа хопіць? Не. Ірванулі ў Сірыю. Паўстае пытанне: навошта? Навошта вы забіваеце людзей? Навошта звяргаеце дзейнага Прэзідэнта? Чым ён вам не дагадзіў? Больш за тое, бойняй у гэтай краіне вы сціраеце першыя сляды нашай з вамі цывілізацыі. Скажыце сусветнай супольнасці, чаго вы хочаце і да чаго вы імкняцеся. Якраз з гэтай трыбуны Генеральнай асамблеі ААН.

Украінскі крызіс. Калі не спынім кровапраліцце ў Еўропе, братазабойчую бойню, дапусцім эскалацыю гэтага канфлікту — горача будзе ўсяму цывілізаванаму свету. Прабачце мне, зробім яшчэ адзін крок да глабальнага канфлікту, а магчыма, да новай сусветнай вайны, ужо ў цэнтры цывілізаванага свету. Няўжо, уступіўшы ў новае тысячагоддзе, мы так і не зразумелі, які крохкі мір і чалавечая цывілізацыя?

Я гэта сказаў не для таго, каб пералічыць вядомыя падзеі, а каб уладных людзей падвесці да адной думкі. Зразумела, сёння няма той сілы, якая вас спыніла б. Але ж кіраўнікі дзяржаў, якія ўчыняюць блюзнерства, — усе вернікі, нават многія публічна моляцца. Але ж Гасподзь бачыць усё. І ён справядлівы. А калі раззлуецца і пакарае вінаватых? Вас, вашы народы, якія пацерпяць бязвінна за вашы авантуры.

Думаю, трэба спыніцца. Трэба дапамагчы людзям бедных краін апрануцца, вылечыцца, атрымаць адукацыю. Накарміце галодных, выратуйце ад гібелі дзяцей, і вам адплаціцца.

СТАР. 2

# КОЖНЫ НАРОД, КОЖНАЯ КРАІНА МАЕ ПРАВА НА ВЫБАР СВАЙГО ШЛЯХУ РАЗВІЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але ўзаемнае адчужэнне характэрнае не толькі для буйных краін. У многіх нават няма жадання зразумець традыцыі, культуру, перакананні іншых народаў.

Відавочна, што аднаўленне балансу — гэта доўгі шлях да шматпалярнага свету. Мы наблізімся да гэтай мэты, калі будзем дзейнічаць, а не пасіўна чакаць.

Неабходна на справе прызнаць, што мы ўсе розныя і што кожны народ, кожная краіна мае права на выбар свайго шляху развіцця. Менавіта ў нашай разнастайнасці — залог агульнага прагрэсу і поспеху кожнага.

Такі падыход дасць магчымасць аднавіць давер у нашым міжнародным жыцці. Але для гэтага неабходна сустракацца і весці дыялог, дамаўляцца, знаходзіць магчымасць канструктыўнага ўзаемадзеяння, а дамовіўшыся, дзейнічаць.

Гісторыя вучыць таму, што любая дзяржава, якая прэтэндуе на аднаасобнае лідарства без аглядкі на інтарэсы іншых, у канчатковым выніку асуджана сама на правал і гібель. Кожная перавага за кошт некага недаўгавечная і непаўнацэнная.

Нездарма народная мудрасць гаворыць: шчасце на чужой бядзе не пабудуеш.

Сучасны свет перажывае крызіс адказнасці. Таму што эгаістычныя інтарэсы і скарацечныя выгады вяршэнствуюць пры прыняцці многіх рашэнняў. Дзеянні шэрагу дзяржаў на міжнароднай арэне часта не ўлічваюць канкрэтную рэальнасць і асаблівасці іншых дзяржаў і грамадстваў.

Упэўнены, калі б было па-іншаму — не было б соцень тысяч людскіх ахвяр у Іраку, Лівіі, Сірыі і іншых краінах, адкуль рынулі патокі бежанцаў, якія ратуюцца ад вайны. Не дапусцілі б з'яўлення «Ісламскай дзяржавы». Не было б успышак тэрарызму ў Еўропе і грамадзянскай вайны ва Украіне. Спіс гэтых «не было б» можна працягваць доўга. І важна сёння пра гэта гаварыць, таму што ў такіх дзяржавах гэтыя народы не зразумеюць нас, калі мы будзем гаварыць і гаворым сёння аб развіцці, таму што мільёнам і мільярдам людзей сёння ў свеце не да развіцця — ім бы з раніцы да вечара дажыць.

Сёння патрэбны адказныя палітыкі, здольныя дзейнічаць глабальна, стратэгічна, гатовыя прымаць рашэнні ў інтарэсах усёй сусветнай супольнасці, ісці на кампраміс дзеля агульнага дабрабыту.

Спадар Старшыня!

Знаходзячыся ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, не магу не закрануць крызісу міжнародных структур.

У цэлым узнікае адчуванне, што іх роля апошнім часам зводзіцца да таго, каб быць месцам спрэчак паміж дзяржавамі, а часта і сродкам націску на асобныя краіны, якія нечым не дагадзілі ўладным людзям.

Паглядзіце на вялікую колькасць рэзалюцый, што прымаюцца ў ААН. Але хіба галасаванне па іх уплывае на вырашэнне канфліктаў? Хіба яно служыць кансалідацыі сусветнай супольнасці? Хіба гэтыя рэзалюцыі паляпшаюць жыццё народаў?

Давайце сумленна скажам: не паляпшаюць! Прагаласавалі — і падзяліліся на нашых і вашых. У выніку яшчэ больш недаверу і раз'яднанасці.

Глыбока перакананы, што ААН не павінна выкарыстоўвацца для дэманстрацыі чыёй-небудзь сілы. Гэта аслабляе арганізацыю і разбурае давер да яе, супярэчыць самой яе прыродзе і прызначэнню.

Нядзіўна, што традыцыйныя міжнародныя структуры адыгрываюць недастатковую ролю як у прадухіленні, так і ва ўрэгуляванні канфліктаў.

Трэба пакласці канец гэтай заганнай практыцы. ААН павінна быць форумам супрацоўніцтва, а не канфрантацыі дзяржаў.

Толькі ўзаемаразуменне і адказнасць, усведамленне разнастайнасці сусветнай супольнасці, аднаўленне даверу дапамогуць усім нам аб'яднацца, забяспечыць мір і бяспеку. Знайсці эфектыўныя адказы на глабальныя выклікі і пагрозы.

Практычным вынікам нашых намаганняў стане ўстойлівае развіццё ўсіх дзяржаў і павышэнне ролі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у сусветнай палітыцы.

Дзякуй за ўвагу.

# МІНСК СТАЎ СІМВАЛАМ МІРУ

## Знаходзячыся ў Нью-Ёрку, Прэзідэнт Беларусі правёў шэраг сустрэч

**Падчас сустрэчы з Генеральным сакратаром ААН Аляксандр Лукашэнка і Пан Гі Мун абмеркавалі сітуацыю на паўднёвым усходзе Украіны, падкрэсліўшы недапушчальнасць у любым канфлікце ахвяр сярод мірнага насельніцтва. Прэзідэнт Беларусі адзначыў неабходнасць прыняцця тэрміновых рашучых захадаў, накіраваных на спыненне ваенных дзеянняў, асабліва з улікам магчымага разрастання канфлікту на ўсю тэрыторыю Еўропы. Генеральны сакратар ААН падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за канструктыўную ролю ў пошуку вырашэння канфлікту ва Украіне, адзначыўшы, што Мінск стаў сімвалам міру.**

Аляксандр Лукашэнка таксама пакінуў запіс у Кнізе подпісаў ганаровых суразмоўцаў Генеральнага сакратара ААН.

Ход і перспектывы ўзаемадзеяння Беларусі з Міжнародным валютным фондам, уключаючы магчымую новую праграму супрацоўніцтва, абмеркаваны на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з дырэктарам-распарадчыкам МВФ Крысцін Лагард. Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў надзею, што ў новай праграме будзе прыменены збалансаваны падыход адносна ўліку інтарэсаў краіны і палітыкі, якую праводзіць дзяржава, па забеспячэнні высокага ўзроўню сацыяльнай абароненасці грамадзян. У час гутаркі Прэзідэнт падзякаваў кіраўніцтву фонду за паспяховую рэалізацыю праграмы стэнд-бай у 2009-2010 гадах, якая дала магчымасць змякчыць негатыўныя наступствы знешняга эканамічнага крызісу.

На пляцоўцы штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку Аляксандр Лукашэнка таксама сустрэўся са старшынёй Дзяржаўнага савета і Савета Міністраў Кубы Раулем Кастра. Лідары дзвюх краін абмеркавалі стан і перспектывы беларуска-кубінскіх адносін па найбольш важных напрамках, з акцэнтам на гандлёва-эканамічную сферу. Бакі адзначылі існуючы патэнцыял для далейшага паглыблення супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі ў розных сферах. Аляксандр Лукашэнка і Рауль Кастра абмяняліся думкамі па найбольш актуальных міжнародных праблемах, пацвердзілі курс на ўзаемную падтрымку ў міжнародных пытаннях.

У Нью-Ёрку кіраўнік беларускай дзяржавы ўсклаў вянок каля Нацыянальнага мемарыяла «11 верасня». Кветкі ад Прэзідэнта леглі таксама на мармуровую пліту насупраць імя адной з ахвяр тэракта 11 верасня — грамадзянкі Беларусі Ірыны Бусло.

Учора позна ўвечары (па мінскім часе) Прэзідэнт Беларусі выступіў у агульнай дыскусіі на юбілейнай, 70-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН. Аляксандр Лукашэнка прадставіў падыходы Беларусі да вырашэння найбольш актуальных і вострых міжнародных праблем сучаснасці.

Прэзідэнт таксама правёў шэраг двухбаковых сустрэч з лідарамі іншых дзяржаў.

■ Меркаванні

# «БОЛЬШАСЦЬ ЛЮДЗЕЙ ДОБРАЙ ВОЛІ З НАМІ САЛІДАРНЫЯ»

**27 верасня Аляксандр Лукашэнка выступіў на пленарным пасяджэнні саміту ААН па ўстойлівым развіцці. «Звязда» спытала ў парламентарыяў і палітолагаў, як тыя ўспрынялі прамову і ў чым, на іх погляд, яе каштоўнасць.**

**Ігар МАРЗАЛЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

— У сваім выступленні Прэзідэнт шчыра, дакладна і трапна вызначыў крыніцу ўсіх тых бед, якія апанавалі сёння многія краіны, у тым ліку і Паўночнай Афрыкі, Сірыю, і тыя наступствы, якія спасціглі тую ж самую Еўропу. Якраз аднапалярны свет, дыктат адной краіны, нежаданне пачуць іншых, імкненне насуперак усяму разумнаму сэнсу, традыцыям, культуры, уніфікаваць усе краіны на адзін лад, прывяло ўрэшце да вайсковых дзеянняў і міграцыйнага крызісу, які абрынуўся на Еўрасаюз.

Найважнейшы пасыл у выступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — гуманістычны. У сваёй прамове ён апелюе да чалавечага жыцця як да найвялікшай каштоўнасці. Таму што калі ён кажа, што мільёнам і мільярдам людзей не да ўстойлівага развіцця, а ім хаця б выжыць, то гэта вельмі моцна пераклікаецца з тымі пасланнямі, якія апошнім часам дасылае свету Папа Рымскі Францішак. У яго апошніх прамовах і словах нашага Прэзідэнта аднолькавы лейтматыў — гуманістычны. Што грошы — не самае галоўнае. Галоўнае — чалавечае жыццё, яго каштоўнасць. Усмешка дзіцяці, магчымасць для кожнага самарэалізавацца ў гэтым свеце.

Здавалася б, выступленне не пра Беларусь, але тут ёсць нюанс і для нас, з улікам прэзідэнцкіх выбараў. Кожны народ мае права быць такім, якім ён хоча быць сам, вызначаць самастойна свой палітычны вектар, палітычную культуру і ніхто, акрамя суверэннага народа, падчас выбараў не мае права мяняць уладу ў краіне.

Па сутнасці, гэта выступленне супраць тых, хто імкнецца маніпуляваць народамі, супраць тых, хто не хоча чуць рэальныя памкненні людзей і не жадае прызнаваць іх выбар: цывілізацыйны, культурны, палітычны.

Прамова Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі — гэта апеляцыя да відавочнага для любога гісторыка факта, што ў кожнага народа свой гістарычны гадзіннік, свая культура, свае традыцыі, і ніхто не мае права ў чужым доме папраўляць свечку. Тым больш пры дапамозе гэтай свечкі падпальваць дом. Выступленне Прэзідэнта — голас супраць гвалту, крыві, апеляцыя да здаровага сэнсу і старой мудрасці, што, перш чым нешта рэзаць, трэба сем разоў адмераць.

**Віталій БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах:**

— У выступленні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі арганічна былі спалучаны гонар і заклапочанасць. Гонар за сваю краіну, якая, нягледзячы на страшныя войны, вялізныя страты людзей і матэрыяльных каштоўнасцяў, змагла выканаць асноўныя мэты чалавецтва, звязаныя з ліквідацыяй голаду і галечы, усталяваннем роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі, сацыяльнай і палітычнай стабільнасцю. Ён адзначыў, што ў нас практычна няма мацярынскай смяротнасці, а смяротнасць немаўлят з'яўляецца адной з самых нізкіх у свеце.

Разам з тым прагучала заклапочанасць нашага лідара лёсам дзяцей, якія нарадзіліся, тым, каб яны маглі жыць пад мірным небам, вучыцца ў школах, а потым працаваць на дабрабыт сваёй радзімы. Кіраўнік нашай дзяржавы адзначыў, што свет прыйшоў да юбілейнага саміту як ніколі падзеленым, і заклікаў лідараў усіх краін цвяроза ацэньваць сітуацыю і прымаць рашэнні ў інтарэсах усёй сусветнай супольнасці.

Прэзідэнт Беларусі заўважыў, што свет не можа быць устойлівым, калі ён аднапалярны. Калі інтарэсы адной краіны вырашаюцца за кошт ушчамлення інтарэсаў іншых краін. Ён падкрэсліў, што мы ўсе розныя, усе маем сваю жыццёвую пазіцыю, свой кірунак развіцця, і толькі з улікам асаблівасцяў усіх мы зможам разумець адзін аднаго і развівацца мірна. Аляксандр Лукашэнка таксама сказаў, што ААН, як і ўсе міжнародныя структуры, павінна заняць сваё месца і не быць цэнтрам разладу, а быць цэнтрам супрацоўніцтва, дыялогу і прыняцця рашэнняў, якія прыносяць карысць усім народам і ўсім краінам свету.

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ, палітычны аналітык:**

— Прэзідэнт Беларусі не першы раз выступае з трыбуны ААН. Ён працягнуў сваю традыцыйную лінію, і для мяне, напрыклад, яго рыторыка сюрпрызам не стала. Кіраўнік дзяржавы спыніўся, па-першае, на тэме міратворчай, па-другое, на неабходнасці навядзення ў свеце больш справядлівага парадку. На жаль, свет у нас сёння аднапалярны, і ёсць некаторыя краіны, якія лічаць, што міжнародныя адносіны — гэта ўрок, на якім яны настаўнікі, а ўсе астатнія — школьнікі. Такія дзяржавы відавочна вучаць не таму, што трэба.

Бо, нагадаю, яшчэ 5-10 гадоў таму многія людзі з Усходняй Еўропы памянялі б месца работы на аналагічны занятак у той жа Лівіі. У гэтай краіне ўзровень жыцця і даходы былі вышэйшыя, чым у многіх краінах Еўрасаюза. А цяпер там, пасля таго, як вырашылі, так бы мовіць, краіну дэмакратызаваць, абвінавацілі яе дзяржаўнага лідара ў тым, што ён нейкі там «няправільны», доўжыцца грамадзянская вайна. «Урок» абярнуўся трагедыяй для ўсіх: у краіне ўсталявалася двоеўладдзе, частку тэрыторыі ўвогуле кантралююць тэрарысты, а Еўропа захлынаецца ад бежанцаў.

Наша краіна, і Аляксандр Лукашэнка як яе кіраўнік, заўсёды акцэнтавала ўвагу на тым, што неабходна імкнуцца да міру і справядлівасці. І добра, што гэта пазіцыя была агучана з такой высокай міжнароднай трыбуны.

Іншая справа, што ААН ужо даўно не з'яўляецца рэгулятарам сусветных працэсаў. Калі трэба прыняць тыя або іншыя сур'ёзныя рашэнні, механізмаў міжнароднага права і ААН ніхто, па сутнасці, не задзейнічае. Згадайце 1999 год, калі шэраг дзяржаў вырашылі праводзіць вайсковую аперацыю ў Югаславіі. Яны праігнаравалі Савет Бяспекі ААН і міжнароднае права.

Таму зараз ААН — гэта, у першую чаргу, магчымасць давесці сваю пазіцыю. Тое, што наш Прэзідэнт гэта зрабіў — цудоўна. Думаю, што большасць людзей добрай волі ва ўсім свеце з намі салідарныя.

**Пётра ПЯТРОЎСКІ, палітолаг, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:**

— У сваім выступе ў Нью-Ёрку лідар Беларусі вызначыў асноўныя рызыкі і небяспекі ў сучасным свеце, памылкі, якія здзяйсняла міжнародная супольнасць. Гэта праблемы бяспекі на Блізкім Усходзе, умяшання адных дзяржаў ва ўнутраныя справы іншых, адказнасці за наступствы такога ўмяшання.

Наш Прэзідэнт таксама заўважыў, што сваю ролю Арганізацыя Аб'яднаных Нацый сёння да канца не выконвае. З-за сваёй непаваротлівасці ААН не можа своечасова рэагаваць на выклікі, якія існуюць у сучасным глабалізаваным свеце.

Апроч таго, кіраўнік нашай дзяржавы падкрэсліў ролю Беларусі ў барацьбе з гандлем людзьмі, наркагандлем, яе ўклад у мір, бяспеку і дабрабыт чалавечай супольнасці.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Выбары–2015

# УСЁ ПА ПЛАНЕ

## Выбарчая кампанія набліжаецца да свайго піку

**У мінулую суботу — 26 верасня — адчыніліся ўчасткі для галасавання. Гэта, па словах старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі Ярмошынай, было зроблена для таго, каб людзі маглі праверыць свае прозвішчы ў спісах выбаршчыкаў.**

— Вы зможаце наведаць выбарчыя ўчасткі непадалёк ад вашага месца жыхарства, — паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама ў відэазвароце на сайце vybory2015.by. — Нам стала вядома — такія звесткі прадставілі абласныя камісіі, Мінская гарадская выбарчая камісія — колькасць выбаршчыкаў, якія пражываюць у нашай краіне. Адразу магу сказаць, што гэта папярэднія звесткі. Натуральна, яны будуць удакладняцца за два тыдні да выбараў і нават у дзень выбараў. Удакладняць іх будуць, перш за ўсё, самі выбаршчыкі, якія будуць прыходзіць на ўчасткі.

Як нагадала Лідзія Ярмошына, больш за ўсё выбаршчыкаў пражывае на тэрыторыі горада Мінска — адзін мільён трыста тысяч. Менш за ўсё — на тэрыторыі Гродзенскай вобласці — няпоўныя 800 тысяч.

Старшыня ЦВК паведаміла пра пасяджэнне Цэнтральнай камісіі, якое адбылося ў мінулы чацвер. Тады былі зацверджаны некаторыя пастановы. Самая галоўная і важная для выбаршчыкаў, па словах Лідзіі Ярмошынай, — пра дакументы, на падставе якіх будуць выдавацца бюлетэні для галасавання. Нагадаем, асноўны дакумент, па якім будзе выдавацца бюлетэнь для галасавання, — гэта пашпарт або даведка органаў унутраных спраў аб яго згубе. Таксама прагаласаваць можна будзе па ваенным і студэнцкім білетах, пасведчанні дзяржаўнага служачага, пенсійным пасведчанні пры наяўнасці фотаздымка і нават па вадзіцельскім.

— Асновай для ўключэння ў спісы выбаршчыкаў з'яўляецца рэгістрацыя — пастаянная або часовая, — паведаміла Лідзія Ярмошына. — Да нас зараз часта звяртаюцца выбаршчыкі з пытаннем, дзе яны могуць прагаласаваць, калі працуюць у Мінску, а зарэгістраваны на тэрыторыі іншай вобласці або горада. У тым выпадку, калі ў вас адсутнічае часовая рэгістрацыя ў Мінску па месцы знаходжання, вы можаце быць уключаны ў спіс выбаршчыкаў на падставе дакументаў, якія пацвярджаюць ваша пражыванне ў Мінску. Напрыклад, дагавора найму кватэры, дагавора аб будаўніцтве жылля або іншых дакументаў.

Гаворачы пра міжнародных назіральнікаў, старшыня Цэнтральнай камісіі адзначыла, што па-ранейшаму ў нашай краіне здзяйсняецца актыўнае назіранне.

— Акрэдытавана ўжо больш за 700 міжнародных назіральнікаў. Прычым большая частка з іх — назіральнікі ад Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Акрамя гэтага, больш за 300 назіральнікаў прадстаўлены ад выканкама Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Таксама акрэдытаваны больш за 18 тысяч нацыянальных назіральнікаў.

Лідзія Ярмошына падкрэсліла, што ўсе мерапрыемствы праходзяць у вызначаныя тэрміны.

— Нашы кандыдаты праяўляюць дысцыплінаванасць, парушэнняў закона не назіраецца, — заявіла старшыня Цэнтральнай камісіі. — Калі яны і ёсць, то носяць нязначны характар і не ўплываюць на вынікі выбараў.

Як праінфармавала старшыня Цэнтрвыбаркама, кандыдаты ў прэзідэнты, іх давераныя асобы актыўна праводзяць сустрэчы з выбаршчыкамі.

— Больш за 1500 мерапрыемстваў заяўлена і часткова праведзена на тэрыторыі нашай краіны. Нашы кандыдаты надрукавалі свае перадвыбарныя праграмы ў сродках масавай інфармацыі. Звяртаю вашу ўвагу, рабілі яны гэта бясплатна. Завяршылася выступленне кандыдатаў у прэзідэнты па тэлебачанні, на наступным тыдні будзе працягвацца трансляцыя іх выступленняў па радыё. Натуральна, 3 кастрычніка — пік усёй выбарчай перадвыбарнай агітацыйнай кампаніі — тэледэбаты, якія пройдуць у прамым эфіры.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

**ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю работу 2 кастрычніка 2015 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).**

**Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 кастрычніка 2015 года з 9.15 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.**

■ Надвор'е

# АМАЛЬ БЕЗ ДАЖДЖОЎ, АЛЕ ЎНАЧЫ — ЗАМАРАЗКІ

**Паўночныя вятры прынеслі на тэрыторыю Беларусі даволі сур'ёзную хвалю холаду, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі Дзмітрый РАБАЎ.**

Увесь тыдзень у нас будзе гаспадарыць антыцыклон, і дажджоў чакаецца не шмат, пераважна па паўночным усходзе краіны. У сераду будзе пераважна без ападкаў, уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Уначы чакаецца толькі плюс 1-7 градусаў, а ў асобных раёнах — слабыя замаразкі да 0 — мінус 2, удзень будзе 8-13 цяпла. Не прагназуецца ападкаў і ў чацвер, толькі раніцай і ўдзень па паўночным усходзе Віцебскай вобласці магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы, стане яшчэ халадней. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман, тэмпература паветра ўначы складзе 1-6 цяпла, на глебе і месцамі ў паветры магчымы замаразкі да 0 — мінус 4 градусаў, удзень чакаецца плюс 8-15 градусаў. Будзе холадна і ў пятніцу, калі па паўночным усходзе краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1-8 градусаў, у асобных раёнах магчымыя замаразкі да 0 — мінус 3, днём будзе 9-16 цяпла. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, менавіта на выхадныя крыху пацяплее. Паўночны вецер зменіцца на паўднёвы і ўсталюецца больш камфортнае надвор'е. Так, у суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўночным усходзе магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3-9 градусаў, аднак на поўдні месцамі на глебе яшчэ прагназуюцца слабыя замаразкі да 0 — мінус 2, удзень будзе 11-17 цяпла, а па паўднёвым захадзе чакаецца да плюс 19 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Педсавет

# ЭКЗАМЕН НА... ГАТОЎНАСЦЬ ЖЫЦЦЯ ПА-ЗА ШКОЛАЙ

**«За незалежнымі формамі ацэньвання ведаў — будучыня», — такую думку выказала на сустрэчы з журналістамі намеснік дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі Людміла ХУДЭНКА.**

Не сакрэт, што ў цяперашніх выпускных экзаменах за курс базавай школы, якія праводзяць «свае» настаўнікі, ніхто сэнсу не бачыць, паколькі яны пазбаўлены аб'ектыўнасці. Таму пры абмеркаванні паправак у Кодэкс аб адукацыі выказвалася прапанова: зрабіць пераход да III ступені адукацыі на аснове **незалежнай выніковай атэстацыі.** Да падобнай практыкі паступова пераходзяць у многіх краінах. Напрыклад, у Расійскай Федэрацыі з гэтага года была ўведзена абавязковая дзяржаўная выніковая атэстацыя дзевяцікласнікаў, якая ажыццяўляецца на незалежнай аснове.

Людміла Худэнка расказала, што ў 2014/2015 навучальным годзе Нацыянальны інстытут адукацыі праводзіў рэспубліканскі эксперымент па апрабацыі мадэлі незалежнай выніковай атэстацыі выпускнікоў базавай школы. Эксперыментам былі ахоплены вучні 14 устаноў адукацыі — па дзве ад кожнага рэгіёна.

— Мы пэўным чынам змянілі як форму экзамену, так і яго змест, — патлумачыла Людміла Худэнка.

На экзамене па рускай мове вучням прапаноўваўся, напрыклад, зрокавы дыктант з прапушчанымі арфаграмамі і пунктаграмамі, паколькі падчас звычайнай дыктоўкі настаўнік, нават міжволі, можа сваімі інтанацыямі рабіць вучням падказкі. Да таго ж дзевяцікласнікі павінны былі даць адказ на прапанаваныя пытанні, якія ахоплівалі розныя раздзелы рускай мовы. Была таксама на экзамене і творчая частка (*аналаг заданняў вобласці С, якія прапануюцца ў Расіі.* — **Аўт.**), дзе вучням трэба было напісаць кароткі пераказ. Па матэматыцы таксама прапаноўваліся заданні з вобласці С, дзе патрабуецца не ўгадаць правільны варыянт, а даць разгорнуты адказ. Прапаноўвалася таксама і комплексная экзаменацыйная работа па прыродазнаўчых дысцыплінах, якая ахоплівала фізіку, хімію, біялогію і геаграфію. Зараз гэтыя прадметы школьнікі на выпускных экзаменах не здаюць.

— Хачу сказаць, што з усімі заданнямі навучэнцы справіліся, хоць на іх атэстат за базавую школу наш эксперымент ніяк не ўплываў. Але ўзніклі пытанні ў ацэнцы заданняў у педагогаў, — канстатавала Людміла Худэнка. — Дарэчы, ацэньвалі экзаменацыйныя работы не «свае» педагогі, а педагогі з іншых устаноў адукацыі — для гэтых мэт ствараліся незалежныя камісіі. Ім патрабаваліся нашы каментарыі і дадатковыя кансультацыі наконт таго, як ацаніць выкананыя работы. Дзеці даволі спакойна паставіліся да экзаменацыйных выпрабаванняў. А вось рэакцыя педагогаў была розная, для іх гэта сітуацыя аказалася больш стрэсавай, чым для вучняў. Па выніках эксперымента была, напрыклад, зроблена выснова, што па-сапраўднаму аб'ектыўна ацаніць заданні частак А і В можна толькі тымі ж метадамі, якія выкарыстоўваюцца на ЦТ, гэта значыць, з дапамогай камп'ютарных тэхналогій. Школьнікам павінны быць прапанаваны стандартызаваныя заданні, якія правяраюцца камп'ютарам, але экзаменацыйная работа абавязкова павінна змяшчаць і заданне творчага характару, якое будзе правярацца незалежным педагогам. На гэты момант праграмны прадукт, які б дазваляў ацаніць веды выпускнікоў базавай школы цэнтралізавана, яшчэ не створаны. Вынікі эксперымента ўсё яшчэ аналізуюцца, і даследчая праца ў Нацыянальным інстытуце адукацыі працягваецца. Чакаць змен у парадку правядзення выпускных экзаменаў за курс базавай школы ў найбліжэйшыя гады не варта, хоць удзельнікі эксперымента і лічаць, што да незалежных формаў ацэньвання трэба ісці.

У 2018 годзе Беларусь упершыню возьме ўдзел у **міжнародным даследаванні PISA**, якое дасць нам магчымасць убачыць сябе на фоне дасягненняў сістэм адукацыі іншых краін.

Адукацыйныя тэсты, якія прапануюцца PISA, правяраюць не столькі акадэмічныя дасягненні навучэнцаў (механічнае завучванне фактаў, законаў, формул, гістарычных падзей і г.д.), колькі іх уменне працаваць з інфармацыяй, прымяняючы свае веды з самых розных галін на практыцы, і рэальныя жыццёвыя кампетэнцыі. Змест адукацыі павінен быць нацэлены на падрыхтоўку дзіцяці да жыцця па-за школай. Між іншым, галоўная праблема нашай сістэмы адукацыі заключаецца якраз у тым, што веды, якія школа дае вучням, не заўсёды патрэбны ім у жыцці. Даследаванне PISA праводзіцца кожныя тры гады, а затым на працягу яшчэ аднаго года аналізуюцца вынікі тэстаў, перш чым яны будуць прадстаўлены сусветнай грамадскасці.

Людміла Худэнка паведаміла, што заданні з кампетэнтнасным падыходам ужо прапануюцца вучням падчас правядзення рэспубліканскага маніторынгу якасці адукацыі, каб падрыхтаваць школьнікаў да будучых выпрабаванняў. Кампетэнтнасны падыход укараняецца і ў вучэбныя планы. У гэтым навучальным годзе на новы змест адукацыі перайшлі першыя і пятыя класы. У наступным годзе гэта будуць другія і шостыя класы і гэтак далей...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**Увага! Прамая тэлефонная лінія**
**29 верасня з 10 да 12 гадзін Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Паўлавіч ГУЛЯКА адкажа на пытанні падчас прамой тэлефоннай лініі.**
**Звяртацца па тэлефоне: 8017 284 89 65.**

## ЧАМУ АБРЫНУЎСЯ КРАН?

**У сталіцы на прыватны дом упаў вежавы кран.**

Здарэнне адбылося каля васьмі гадзін раніцы па вуліцы Грушаўскай. Тут, побач са школай і дзіцячым садам, вядзецца будаўніцтва шматкватэрнага жылога дома. Пад'ёмны кран упаў часткова на саму будоўлю і на дом прыватнага сектара, жыльцоў з якога рассяляюць, а таксама прыпаркаваны побач аўтамабіль. Дом драўляны, аднапавярховы, падзелены на тры кватэры. Па інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, пацярпеў кранаўшчык 1990 года нараджэння. Яго ў цяжкім стане шпіталізавалі. Праведзена экстраннае пасяджэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях адміністрацыі раёна. Жыльцоў часова перасяляць у падменны фонд. На месцы здарэння вядуцца аварыйна-выратавальныя і аднаўленчыя работы. Працуе камісія па ўстанаўленні прычын падзення крана, відавочцам дапамогу аказвае псіхолаг МНС.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ВАРУШЫНАК З СУШКАМІ

**Маштабная зарадка пад назвай «Варушынак» для навучэнцаў і выкладчыкаў на працягу мінулага тыдня праходзіла ў Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П. Сухога. Пляцоўка ля галоўнага корпуса штодзень запаўнялася студэнтамі, якія выконвалі фізічныя практыкаванні пад кіраўніцтвам інструктараў.**

«Варушыцца» на вялікім перапынку культарганізатары ўсіх факультэтаў прапаноўвалі ў рытмах, напрыклад, лацінаамерыканскіх танцаў. Дарэчы, ініцыятарамі акцыі, якая адбылася другі раз, сталі супрацоўнікі студэнцкай газеты «Сушка» і аддзел выхаваўчай работы з моладдзю навучальнай установы. Як адзначыла яго спецыяліст Аляксандра Саранчук, галоўнай мэтай было не проста «разварушыць» студэнтаў, але і аб'яднаць увесь палітэх. У адзін з дзён зарадку правёў прарэктар па навучальнай і выхаваўчай рабоце Віктар Кірыенка.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*astashkevich@zviazda.by*

**Экономическим судом города Минска 23 сентября 2015 года возбуждено производство по делу №889-8Б/2015 о банкротстве и открыто конкурсное производство в отношении Общества с ограниченной ответственностью «Авенариус»** (юридический адрес: 220005, Минск, ул. Смолячкова, 9, ком. 426, УНП 191636448).
Претензии кредиторов принимаются в двухмесячный срок с момента публикации настоящего объявления управляющим ИП Гетман Павел Николаевич (почтовый адрес: 220125, г. Минск, ул. Гинтовта, 44-167, тел. 8017-2635878).
Первое собрание кредиторов состоится по адресу: г. Минск, ул. Славинского, 1, каб. 204, в 12 часов 00 минут 30 ноября 2015 года.
УНП 191208360

Утерянный бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС **считать недействительным.** УНП 100985903

КАНТАКТ
№ 5 (33)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»
Сумесны выпуск з РУП «Белпошта»



# Адным — новыя аддзяленні, а другім — мабільныя пункты

## Якія аб'екты паштовай сувязі запатрабаваны ў сталіцы, а якія — у глыбінцы

**Нядаўна ў Маскоўскім раёне Мінска на вуліцы Каралінскай, 10 адкрыліся новы пункт па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў і цэнтр комплекснага абслугоўвання карпаратыўных кліентаў «Бізнес-пошта».**

Пункт па прыёме і выдачы адпраўленняў стаў чацвёртым па ліку ў сталіцы. Тут прымаюць і выдаюць пасылкі і дробныя пакеты, што паступаюць на адрасы, якія знаходзяцца ў зоне абслугоўвання 25-га, 45-га і 116-га аддзяленняў паштовай сувязі.

— Пошта не стаіць на месцы, і сёння мы стараемся аказваць паслугі з улікам ІТ-тэхналогій, — адзначыла падчас адкрыцця **намесніца генеральнага дырэктара «Белпошты» па камерцыйных пытаннях Таццяна ГВОЗДЗЕВА.**

Сапраўды, тэхналогіі ў аддзяленні на ўзроўні. Выдаваць адпраўленні ў самыя кароткія тэрміны дапамагае спецыяльнае праграмнае забеспячэнне, а лазерны сканер па штрыхкодзе вызначае, дзе на стэлажы ляжыць той ці іншы пакет або пасылка. Сістэма інтэрнэт-заказаў набірае ўсё большую папулярнасць: за 8 месяцаў гэтага года ў сталіцы ўжо даставілі столькі міжнародных адпраўленняў, колькі за ўвесь мінулы год. А яшчэ ж не было навагодніх свят, на якія прыпадае іх пік!

Апроч асноўнага профілю паслуг, у пункце ёсць магчымасць скарыстацца тэрміналам, дзе ў рэжыме самаабслугоўвання пры дапамозе банкаўскай карткі можна здзейсніць камунальныя плацяжы, падпісацца на любімыя перыядычныя выданні і многае іншае — усяго больш за 30 паслуг. Працуе пункт без выхадных, у будныя дні з 8.00 да 21.00, у выхадныя з 10.00 да 20.00.

Як адзначыў **начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Віктар БУТРЫМ,** пункт абслугоўвае 12 тысяч чалавек, тут магчыма апрацоўваць да 1000 адпраўленняў за суткі. А цэнтр комплекснага абслугоўвання карпаратыўных кліентаў «Бізнес-пошта» зможа ахапіць 250 сталічных арганізацый. Цэнтр — гэта спецыяльныя рабочыя месцы для прыёму і апрацоўкі пошты ад юрыдычных асоб, дзе спецыялісты па продажы паслуг афармляюць заказы і кансультуюць карпаратыўных кліентаў. Тут створана асобная лінейка паслуг: прыём і апрацоўка паштовых адпраўленняў, рэалізацыя паштовак, канвертаў, марак, бланкаў строгай справаздачнасці, прыём грашовых пераводаў, дастаўка адпраўленняў у офіс «Паштовым кур'ерам» і інш. «Бізнес-пошта» на Каралінскай


Лазерны прамень прыстасавання, з якім працуе аператар Ірына ЛАЎРЫНОВІЧ, дакладна распазнае інфармацыю на адпраўленні.

«Хуткая пошта» падрыхтавана да дастаўкі адрасатам, — зазначыла начальнік цэнтра «Бізнес-пошта» Таццяна ВАЙЦЕНКОВА.

Фота Яўгена ПРОСЕЦКАГА.

нэт-краме, і забірае адпраўленні. Прычым кліенту не трэба нават запакоўваць — усё зробім мы.

Цэнтр «Бізнес-пошта» будзе працаваць з панядзелка па пятніцу з 9.00 да 18.00, субота і нядзеля — выхадныя.

На цырымоніі адкрыцця прысутнічаў **начальнік упраўлення эканомікі адміністрацыі Маскоўскага раёна Юрый РАБКАВЕЦ.** Ён агледзеў новыя паштовыя аб'екты і прапанаваў кіраўніцтву «Белпошты» памяшканні для адкрыцця наступных аддзяленняў.

Пакуль у Маскоўскім раёне думаюць над гэтым пытаннем, новы паштовы пункт ужо ў кастрычніку адкрыюць у Парку высокіх тэхналогій. Яшчэ адна навінка — прылады самаабслугоўвання для адпраўкі паштовых адпраўленняў — цягам наступнага месяца пачнуць з'яўляцца ў аддзяленнях сталічнай пошты. Пакуль што працуе толькі адна такая: яе ўсталявалі на Галоўпаштамце. Яна дае магчымасць кліенту самастойна ўзважыць сваю пасылку, аплаціць паслугу праз інфакіёск і без удзелу аператара адправіць на патрэбны адрас.

Калі казаць пра новаўвядзенні на перыферыі, то некаторыя з іх агучыў **першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Беларусі Дзмітрый ШАДКО.** Ён адзначыў, што прыярытэт у галіне надаецца ўвядзенню бескантактных метадаў работы, у першую чаргу гэта тычыцца безнаяўных спосабаў аплаты і магчымасці дыстанцыйнага заказу пасылкі. Такое ўжо можна зрабіць пры дапамозе тэрміналаў, якія ёсць ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі, а ў хуткім часе з'явяцца і паштаматы для таго, каб можна было самастойна атрымаць пасылку без удзелу аператара.

— Работа ў нас цяпер у самым разгары. Наступны крок — мабільныя паштовыя аддзяленні, якія ўяўляюць з сябе поўны функцыянал у рамках аднаго транспартнага сродку. Ён будзе прыязджаць у населены пункт, жыхары змогуць скарыстацца ў ім аналагамі банкамата, банкаўскага тэрмінала і атрымаць усе тыя паслугі, якія ёсць у гарадскім стацыянарным аддзяленні.

Праўда, казаць пра тое, што ў кожным з больш яе 3000 сельскіх паштовых аддзяленняў у найбліжэйшы час з'явіцца тэрмінал, пакуль заўчасна — гэта дыктуюць суадносіны «кошт — якасць». Бо аснашчаць па апошнім слове навукі і тэхнікі паштовае аддзяленне ў населеным пункце, дзе засталося 100 чалавек, на думку Дзмітрыя Шадко, немэтазгодна. Затое ў многіх сельскіх пунктах ужо перайшлі да індывідуальнага абслугоўвання, дзе паштальён ведае кожнага свайго патэнцыяльнага кліента. Бо ніякія тэхналогіі пакуль што не заменяць прысутнасці паштальёна і простай чалавечай увагі да людзей.

■ А вы ведалі?

# ПРЫЙШОЎ ПА ПЕНСІЮ, А ТРАПІЎ... У ГУЛЬНЮ!

**З нагоды 20-годдзя «Белпошты» ў некаторых паштовых аддзяленнях краіны прайшлі святочныя віктарыны. Супрацоўнікі падрыхтавалі для наведвальнікаў серыю пытанняў на тэму «Што вы ведаеце пра пошту?». На адной з такіх віктарын, якая ладзілася на Галоўным паштамце сталіцы, пабывала і «Звязда».**

У пасляабедзенны час буднага дня наведвальнікаў у круглай зале паштамта не так ужо і шмат. Але як толькі дзяўчаты-супрацоўніцы падрыхтавалі месца для правядзення віктарыны, туды адразу ж пацягнуліся людзі. Некаторыя, як пенсіянерка Раіса Мікалаеўна, даведаліся пра яе па радыё і спецыяльна прыйшлі, каб паўдзельнічаць.

— Я ў захапленні! — прызналася жанчына. — Вядома, моладзь больш за мяне ведае, бо я не разбіраюся ў інтэрнэце, але не сказала б, што пытанні былі складанымі.

Каб даведацца, аб чым пыталіся ў наведвальнікаў, а заадно праверыць свае веды, бяру бланк, на якім надрукаваны шэсць пытанняў з некалькімі варыянтамі адказаў. Спачатку трэба адказаць, якая птушка з'яўляецца сімвалам паштовай сувязі. Нават нягледзячы на прапанаваныя варыянты (сярод іх былі чайка і ластаўка), выбіраю голуба. Хто ж не чуў пра галубіную пошту?

А вось на другое пытанне — калі ў Мінску з'явілася першае паштовае аддзяленне? — прызнаюся шчыра, адказвала наўгад. З прапанаваных варыянтаў — 1921, 1891 і 1981 — выбіраю другі. Толькі пасля разумею, што зрабіць выбар дапамагла інфармацыя, якую бачыла на сайце «Белпошты». Аказваецца, захоўваецца нешта ў далёкіх закутках памяці!

Адказаць, што такое посткросінг (абмен паштоўкамі паміж людзьмі з усяго свету), было вельмі проста, бо калісьці сама ім займалася. Аднак чацвёртае заданне прывяло мяне ў лёгкі ступар. Трэба было выбраць правільны варыянт напісання адраса на канверце. Я неаднойчы дасылала папяровыя лісты, якія паспяхова даходзілі да адрасатаў, але майго варыянта напісання сярод прадстаўленых на бланку не аказалася...

Праўда, падумаўшы, зрабіць правільны выбар аказалася зусім нескладана. Але каб не было непрыемнасцей, лепш запомніць: спачатку пішуцца прозвішча, імя і імя па бацьку адрасата, потым вуліца, нумары дома і кватэры і толькі пасля індэкс і горад.

Наступныя два пытанні былі, як сказала Раіса Мікалаеўна, «для моладзі»: у іх ішла гаворка пра паслугі «Белпошты» і яе інтэрнэт-краму.

Па выніках віктарыны аказалася, што ўсе мае адказы былі правільнымі. За гэта мне, як і ўсім удзельнікам, падарылі фірменныя кішэнныя люстэрачкі, канцылярскія наборы, асадкі з лагатыпам «Белпошты». А дзяўчына, якая адказвала на пытанні побач са мной, патлумачыўшы, што займаецца посткросінгам, папрасіла набор паштовак (іх, дарэчы, у гэты дзень раздавалі ўсім кліентам Галоўпаштамта — яшчэ адна нагода даслаць цёплае паведамленне блізкім).

Многія ведалі пра віктарыну. Адна жанчына падышла да вядучай са словамі: «Добры дзень! Са святам! Што там за пытанні, давайце паспрабую адказаць!» А даўшы адказы, стала актыўна цікавіцца паштовымі паслугамі і сайтам прадпрыемства.

Зрэшты, прыходзілі і людзі, зусім не падрыхтаваныя да такога «сюрпрызу»: нехта атрымліваў пенсію, хтосьці адпраўляў лісты — і трапляў на віктарыну... Але ва ўсіх, хто выходзіў з Паштамта, эмоцыі былі станоўчымі.

— Амаль усе спраўляюцца з віктарынай выдатна, самым складаным пытаннем аказалася гістарычнае — пра дату з'яўлення першага паштовага аддзялення ў Мінску, — заўважыла вядучая, **спецыяліст «Белпошты» Надзея ВЕРАШЧАКА.** — Людзі ведаюць і пра нашы паслугі і інтэрнэт-краму, бо інфармацыя пра іх ёсць паўсюль: на сайце прадпрыемства, друкаваных СМІ, сацыяльных сетках, на радыё, у транспарце...

Дарэчы, у Мінску падобныя акцыі праходзілі яшчэ ў двух паштовых аддзяленнях: №6 па вуліцы Маякоўскага і №22 на Шаранговіча. Віктарыны з нагоды 20-годдзя «Белпошты» адбыліся ва ўсіх абласных і некаторых раённых гарадах

■ Добрая навіна

# «МАРК ШАГАЛ. ЗАКАХАНЫЯ»...

## Цяпер — і на паштовых марках

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь з сённяшнега дня выпускае ў абарачэнне паштовыя маркі «Восіп Цадкін. Возера. 1925», «Хаім Суцін. Ева. 1928», «Марк Шагал. Закаханыя. 1981», «Восіп Любіч. Пейзаж з чырвоным дахам» з серыі «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі». Праект падрыхтаваны па матэрыялах з карпаратыўнай калекцыі Белгазпрамбанка пры садзейнічанні цэнтра візуальных і выканаўчых мастацтваў «АРТ Карпарэйшн». У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне ў Нацыянальным мастацкім музеі (вул. Леніна, 20) будзе праводзіцца на канверце «Першы дзень» спецыяльнае гашэнне. У яго цырымоніі (пачатак — у 14.00), як плануецца, прымуць удзел **старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар БАБАРЫКА, генеральны дырэктар прадпрыемства «Белпошта» Ірына САКСОНАВА, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПРАКАПЦОЎ...**

Відавочна, што выпуск, прысвечаны творчасці мастакоў Парыжскай школы з Беларусі, паслужыць шырокай прапагандзе культурнай спадчыны Беларусі, зойме годнае месца ў філатэлістычных калекцыях і стане выдатным падарункам аматарам мастацтва. Ён прымеркаваны да 25-годдзя Белгазпрамбанка, які першым з беларускіх банкаў прычыніўся да выпуску паштовых марак.

**Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

■ Віншуем!

# ЛІК НА СТАГОДДЗІ,

## або Новы рэцэпт даўгалецця

**У гэтым месяцы юбілей, ды не просты, а 100-гадовы, адзначае Ганна Васільеўна КІСЯЛЁВА. З іх амаль чвэрць стагоддзя жанчына адпрацавала ў паштовай галіне!**

Нарадзілася Ганна Васільеўна 9 верасня 1915 года ў вёсцы Казьяны Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Сваю працоўную дзейнасць пачала з настаўніцтва. А з 1962 па 1986 год працавала ў цэху экспедзіравання друку вытворчасці «Мінская пошта».

Юбілярка, нягледзячы на ганаровую дату, вельмі сціплая, расказваць пра сябе журналістам не прывыкла. Адзначыла толькі, што яе найлепшыя жыццёвыя ўспаміны звязаны з поштай. «Такім чынам, — пажартавала **генеральны дырэктар «Белпошты» Ірына САКСОНАВА,** — вынайдзены новы рэцэпт даўгалецця: калі хочаш пражыць 100 гадоў, ідзі працаваць на пошту.

Усё ж схавацца ад урачыстых віншаванняў Ганне Васільеўне не ўдалося. Цёплыя словы і падарункі ёй перадалі кіраўніцтва «Белпошты» і прадстаўнікі адміністрацыі Ленінскага раёна сталіцы.

«Звязда» таксама далучаецца да віншаванняў і зычыць Ганне Васільеўне моцнага здароўя, увагі блізкіх і дабрабыту!

■ Прафесіяналы

# ЗВЯЗАНЫЯ АДНОЙ... ПОШТАЙ

## У Астрашыцкім гарадку вызначылі найлепшых паштальёнаў і аператараў паштовай сувязі краіны

**«Белпошта» ў верасні адзначае 20-годдзе! Да таго ж сёлета, у 2015-м, спаўняецца 110 гадоў Беларускаму прафсаюзу работнікаў сувязі... Менавіта гэтым падзеям, а таксама 70-годдзю Перамогі, Году моладзі і Сусветнаму дню пошты і быў прысвечаны Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства аператараў сувязі і паштальёнаў, які праводзіўся ўжо ў 19-ты раз на базе адпачынку «Дружба».**

### КАМАНДЫ, НА СТАРТ!

Дык якія ж яны, сучасныя паштальёны і аператары? У першую чаргу гэта людзі дасведчаныя, добра знаёмыя з тэхналогіямі. Але як раней, так і цяпер, людзей гэтай прафесіі вылучае вялікая адказнасць і працавітасць. Таму не сакрэт, што для супрацоўнікаў пошты правядзенне конкурсу — гэта штогадовае заахвочванне, добрая магчымасць убачыць і адзначыць самых яркіх, самых прафесійных работнікаў. А талентаў і крэатыўнасці ім не пазычаць — у гэтым мы пераканаліся. Зрэшты, усё па парадку.

Да ўдзелу ў спаборніцтве падрыхтаваліся сем каманд — па адной ад кожнага абласнога філіяла, а таксама каманда вытворчасці «Мінская пошта» — амаль 70 прафесіяналаў з кожнага рэгіёна Беларусі — з гарадскіх і сельскіх аддзяленняў сувязі — выбралі для сябе складаную, адказную, але вельмі патрэбную людзям працу. Бо як бы ні развівалі тэхналогіі, без паштальёнаў, якія даставяць адпраўленні і падпісныя выданні адрасату, без аператараў, якія дапамогуць атрымаць тую ці іншую паштовую паслугу, не абысціся. У спёку і сцюжу яны прыносяць людзям лісты і перыёдыку, пенсіі і дапамогі...

Пра гэта падчас урачыстага адкрыцця конкурсу лірычна распавёў ансамбль народнай песні «Жывіца» (у склад якога, дарэчы, таксама ўваходзяць паштовыя работнікі), які выканаў песні «Пошта палявая» і «Паштовае пісьмо».

Гендырэктар «Белпошты» Ірына САКСОНАВА жадае канкурсантам удачы.

### ПЯЦЬДЗЯСЯТ АДЦЕННЯЎ... СІНЯГА

Падчас конкурсу яскрава відаць: у «Белпошты» — жаночае аблічча, бо сярод прыгажунь-удзельніц можна было заўважыць толькі некалькі мужчынскіх постацей. Творчы падыход і жаноцкасць кожнай каманды праявіліся нават у адзенні: усё яно было вытрымана ў карпаратыўных колерах прадпрыемства — белым і сінім, але якіх толькі адценняў і фасонаў тут не было! І сукенкі, і касцюмы — са спадніцамі, з нагавіцамі, ад пяшчотнага блакіту да насычанага ўльтрамарыну. Зрэшты, гэта і зразумела: дэманстрацыя фірменных строяў уваходзіла ў заданне для прадстаўлення, тэма якога «Мы — калектыў, мы — каманда, мы — адна паштовая сям'я». І хоць у «візітоўцы» ўдзельнікі максімальна праявілі свае таленты, гэта было не адзінае заданне для іх. Наперадзе — дэманстрацыя дамашняга задання (прэзентацый). Але галоўнае, дзеля чаго работнікі штогод збіраюцца на конкурс, чакала іх на другі дзень: інтэлектуальнае задан-

Каманда Гродзеншчыны: «Мы — адна паштовая сям'я!».

Фота Надзеі БУЖАН.

не — тэарэтычныя і практычныя выпрабаванні, камп'ютарныя тэсты, дзе канкурсанты павінны былі паказаць найлепшыя прафесійныя якасці і максімум ведаў.

— Часы, калі нашы аператары ўдзельнічалі ў конкурсах, узброеныя сургучом, пілой і шпагатам, даўно мінулі. Цяпер яны працуюць з ІТ-тэхналогіямі, — з усмешкай адзначыла **генеральны дырэктар «Белпошты» Ірына САКСОНАВА.**

Яна заўважыла, што сёння пошта аказвае тыя ж паслугі, што і сто гадоў таму, але ўжо ў новым, тэхналагічным, афармленні.

**Першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Беларусі Дзмітрый ШАДКО,** які прысутнічаў на адкрыцці конкурсу, падкрэсліў, што да рэспубліканскага фіналу дайшлі найлепшыя з найлепшых прафесіяналаў, тыя, хто вытрымаў строгі адбор на раённым і абласным этапах.

— «Белпошта» — гэта жамчужына нашай галіны. І я ўпэўнены, калі мы дасягнём свайго 100-гадовага юбілею, яна будзе працягваць існаваць і займаць годнае месца ў краіне, — пераканаўся намінстра.

### ЗАПАСАЙЦЕСЯ ПАПЯРОВЫМІ КАНВЕРТАМІ

Тэмай дамашняй прэзентацыі стала «Пошта будучыні вачыма моладзі». Актуальная яна не толькі дзякуючы імкліваму развіццю тэхналогій, з якімі прадпрыемства імкнецца крочыць у адным тэмпе, але і праз тое, што тут працуюць больш за 7000 маладых людзей да 31 года.

На паказ прэзентацыі кожная каманда мела 7 хвілін. Але і за гэты невялікі час фантазія работнікаў пошты сягала вельмі далёка — ажно на 300 гадоў наперад. Так, брастаўчане ўявілі, якія тэхналогіі прыйдуць у галіну ў найбліжэйшыя гады, а канкурсанты з Віцебска паказалі гісторыю развіцця пошты ад галубоў да касмічных караблёў, якія, упэўнена каманда, зусім хутка будуць дастаўляць пасылкі і лісты між планетамі. Звыклай справай стане выкарыстанне робатаў, галаграфічных лістоў і тэлепартацыя паштальёнаў.

Найбольш рэалістычна на будучыню паглядзеў гомельскі філіял: яго прадстаўнікі прапанавалі некаторыя паслугі, якія магчыма ўвесці на сайце «Белпошты». Напрыклад, стварыць электронную бібліятэку, адкуль можна будзе пампаваць кнігі, для студэнтаў арганізаваць магчымасць падачы заявак на паездкі ў міжнародныя лагеры, а для пенсіянераў — замаўляць медыкаменты анлайн і многае іншае. Прадстаўнікі гродзенскага філіяла лічаць, што будучыня пошты — за маладымі спецыялістамі, неабыякавымі і мабільнымі, настроенымі на рэформы.

Каманда мінскага філіяла пафантазіравала, як у 2035 годзе на пошце з'явяцца віртуальныя кансультанты, пасылку можна будзе даслаць у любую кропку свету адным дотыкам, а паштальёны (дакладней, паштовыя агенты) будуць перамяшчацца на мабільных карах, што кіруюцца партатыўнымі навігатарамі.

Каравай ад каманды мінскага філіяла.

«А што такое пошта без любові?» — задалася пытаннем каманда з Магілёва і паказала сцэнку па матывах «Трох мушкецёраў» пад назвай «Пошта 300 гадоў пасля». І тут не абышлося без робатаў, якія мусяць выконваць самую цяжкую працу, аднак і традыцыйным паштальёнам знайшлося месца: яны, ва ўяўленні магіляўчан, стануць кіраваць былымі сартавальнымі цэнтрамі.

Нарэшце, сваё бачанне будучыні прадставіла вытворчасць «Мінская пошта». На думку каманды, неўзабаве запануюць штучны інтэлект і татальная спадарожнікавая сувязь з бязмежнымі магчымасцямі. Аператараў заменяць тэлепартатары — спецыяльныя прылады, якія будуць дастаўляць адпраўленні. А самым дарагім і каштоўным з іх стане... звычайны папяровы канверт, бо папера будзе ў дэфіцыце...

Адзін з афармленых камандамі стэндаў.

### АДЗІН ЗА ЎСІХ, І ЎСЕ — ЗА АДНАГО

У дамашняе заданне каманд уваходзіла і афармленне стэндаў «Помніце, якой цаной заваявана шчасце». Не складана здагадацца, што стэнды адлюстроўвалі ваенную тэматыку. На іх можна было ўбачыць фотаздымкі як часоў вайны, так і сучасныя фотакарткі з ветэранамі, лісты і паштоўкі, у тым ліку і знакамітыя «трохкутнікі», а таксама іншыя рэчы, якія дапамагалі падтрымліваць сувязь.

Нарэшце, пасля двух дзён конкурснай барацьбы, ацаніўшы дамашнюю падрыхтоўку і праверыўшы веды канкурсантаў на практыцы, журы мусіла зрабіць выбар.

У камандным заліку найбольшую колькасць балаў набраў **мінскі філіял**. У тройцы лідараў сярод каманд аказаліся таксама **гомельскі філіял і каманда вытворчасці «Мінская пошта»,** якія занялі другое і трэцяе месцы адпаведна.

Сярод паштальёнаў па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных СМІ першае месца заняла паштальён АПС Гомель-28 **Любоў Банадысева**, другое — паштальён АПС Балотня Рагачоўскага РВПС **Вольга Міронава**, трэцяе — **Святлана Пасечнік**, паштальён АПС Мінск-37.

Найлепшымі сярод аператараў сувязі сталі **Кацярына Курчанка** з АПС Полацк-14, якая заняла першае месца, **Алена Сянчук** са Свіслацкага ВПС і аператар сувязі Мар'іна Горка-4 Пухавіцкага РВПС **Кацярына Віславус**, якія занялі другое і трэцяе месцы адпаведна.

— Кожны конкурс, які даводзіцца судзіць, унікальны. Хоць мы ўвесь час робім заданні і пытанні больш складанымі, мая ацэнка прафесіяналізму і творчасці супрацоўнікаў аддзяленняў сувязі — на самым высокім узроўні, — падсумавала старшыня журы, **першы намеснік генеральнага дырэктара «Белпошты» Алена СКРЫПЧЫК.**

Пераможцы атрымалі грашовыя прызы і памятныя сертыфікаты. У дадатак да ўзнагарод у намінацыях удзельнікі ўсіх рэгіёнаў атрымалі падарункі ад прафсаюзнай арганізацыі

■ Ёсць нагода

# АД ГАЛУБОЎ ДА ПРАСТОРАЎ ГАЛАКТЫКІ

**ДА 20-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ «БЕЛПОШТА» ПАДЫШЛА АДНОЙ З НАЙЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ**

**Калісьці пошту развозілі на конях. Так і ўяўляеш адзінокага падарожнага сярод чыстага поля на ўзмыленай жывёле, якая за шматгадзінны шлях праскакала не адзін дзясятак вёрст. Паштар з апошніх сіл кіруе канём, бо мусіць даставіць лісты дацямна, стомлены, «з тоўстай сумкай на рэмені», і далей па тэксце.**

**Цяпер, калі ў гарадах і вёсках сталі даступнымі электронныя паслугі, гэта нават гучыць смешна. Бо на пошце пануе поўная аўтаматызацыя вытворчых працэсаў, ёсць уласная інфармацыйна-тэхналагічная сетка рэспубліканскага маштабу, куды ўваходзяць стацыянарныя і перасоўныя аддзяленні паштовай сувязі. Так што пра рамантычны перыяд паштовых галубоў і бясстрашных пасланцоў, якія дастаўляюць важныя дэпешы, застаецца толькі ўздыхаць.**

Але ці варта? Па ацэнцы міжнародных экспертаў, «Белпошта» трымае высокую планку сярод дзяржаў СНД, еўрапейскіх краін, а таксама ўдзельнікаў Сусветнага паштовага саюза. Беларуская пошта прызнана адной з найлепшых паштовых службаў у свеце па ўзроўні развіцця электронных паслуг. Паводле даследавання, праведзенага тым жа СПС, наша краіна ўвайшла ў топ-10 паштовых службаў свету, у якіх электронныя паштовыя паслугі атрымалі найбольшае развіццё, заняўшы ганаровае другое месца.

Беларусь — першая краіна ў рэгіёне СНД, пошта якой у 2013 годзе ўдастоена сертыфіката S42 Сусветнага паштовага саюза, што пацвярджае міжнародны стандарт адрасавання S42. Апроч гэтага, наша пошта мае шэраг іншых сертыфікатаў, якія сведчаць аб адпаведнасці якасці яе паслуг у краіне сусветным стандартам.

Прадпрыемства выкарыстоўвае ў сваёй працы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, укараняе новыя паслугі, грунтуючыся на патрабаваннях спажыўцоў. Бо сёння пошта — гэта не толькі дастаўка лістоў, пакетаў і пасылак, хоць пералічаныя паслугі, безумоўна, асноўны, профільны напрамак. Але нават яго работнікі пошты імкнуцца ўдасканаліць.

Карпаратыўных кліентаў цяпер абслугоўваюць у выдзеленых цэнтрах «Бізнес-пошта».

З пачатку мінулага года з'явілася магчымасць атрымліваць пенсіі і дапамогі ў аддзяленнях сувязі незалежна ад месца пражывання. Таксама беларуская пошта прадастаўляе паслугі інфармацыйнага пасрэдніка ў доступе жыхароў краіны да дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў праз узаемадзеянне з агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмай (ААІС).

Адкрываюцца спецыяльныя пункты па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў. Усё большую папулярнасць сярод насельніцтва маюць плацежна-даведачныя тэрміналы, пры дапамозе якіх можна без камісіі афармліць падпіску, аплаціць камунальныя паслугі, мабільную сувязь, крэдыты і іншае, адсачыць шлях паштовага адпраўлення.

Па ўсёй краіне ўсталявана больш за дзевяцьсот тэрміналаў, амаль дзвесце з іх — у Мінску.

Сёлета адкрылася эксклюзіўная паштовая інтэрнэт-крама беларускіх тавараў Shop.belpost.by, якая неўзабаве мусіць стаць найбуйнейшай віртуальнай гандлёвай пляцоўкай. Крама аб'ядноўвае вядучыя айчынныя брэнды, прапануе больш за 3000 найменняў тавараў беларускіх вытворцаў. У будучыні ёсць ідэя развіваць такі гандаль і на іншыя краіны — у першую чаргу рэгіён СНД і Еўропу.

**«Белпошта» сёння:**

- 6 абласных філіялаў;
- філіял «Вузел спецыяльнай сувязі»;
- вытворчасць «Мінская пошта»;
- аўтатранспартная вытворчасць;
- 91 раённы і гарадскі вузлы паштовай сувязі;
- 3255 аддзяленняў паштовай сувязі (у тым ліку 767 гарадскіх, 2071 сельскае, 226 перасоўных, 191 пункт паштовай сувязі);
- 8243 даставачныя ўчасткі;
- 1644 аўтамабілі

Гэта яшчэ не ўсе дасягненні, з якімі прадпрыемства падышло да свайго юбілею. Зрэшты, 20 гадоў — не так ужо і шмат, калі ўлічыць, што гісторыя беларускай пошты паглыбляецца ў Сярэднія вякі. Прадпрыемства сапраўды хутка рэагуе на павевы часу, таму, што б там ні казалі скептыкі, пошта захаваецца. Пытанне толькі ў тым, якую форму яна прыме ў будучыні. Можа, фантазіі пра міжгалактычную — не такія ўжо і фантазіі?..

Матэрыялы паласы падрыхтавала Дзіяна СЕРАДЗЮК

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (почасовой) имущества, принадлежащего унитарному предприятию «Минское отделение Белорусской железной дороги» на праве хозяйственного ведения

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Часть здания Минского Дворца культуры и спорта железнодорожников с инв. № 500/С-26172, а именно:<br>- барная стойка и подсобные помещения верхнего кафе. Площадь, сдаваемая в аренду, – 83,7 кв.м. Сумма арендной платы за 1 час с НДС – 80 400 бел. руб.;<br>- барная стойка и подсобные помещения гостиной (нижнее кафе). Площадь, сдаваемая в аренду, – 16,2 кв.м. Сумма арендной платы за 1 час с НДС – 15 600 бел. руб. | **г. Минск, ул. Чкалова, 7** | **Начальная цена продажи права с НДС, руб.** | **Задаток, руб.** | **Срок договора аренды** |
| | | | **2 997 000** | **299 700** | **по 31.12.2015** |

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. №150.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Почасовая арендная плата.

Условия для Победителя аукциона (Претендента на покупку), который будет осуществлять торговую деятельность в арендуемом Объекте:
- режим работы устанавливается в соответствии с еженедельным планом КСЦ;
- обслуживание только для посетителей культурно-массовых и физкультурно-оздоровительных мероприятий КСЦ;
- наличие стационарной базы арендатора для изготовления собственной продукции с соблюдением санитарных норм;
- произвести необходимый косметический ремонт за счет средств арендатора;
- арендатор должен соблюдать действующее законодательство Республики Беларусь в области торговли и общественного питания.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение) и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 10 000 000 рублей.

**Аукцион состоится 30.10.2015 в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%.**

Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению. Подача документов по почте не допускается.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.* Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды (почасовой) имущества, принадлежащего унитарному предприятию «Минское отделение Белорусской железной дороги», проводимом 30 октября 2015 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений **28.10.2015 в 12.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Ванкевич Лариса Александровна, 8 (017) 207-84-50, 8 (029) 674-43-31.

**☎ Организатор аукциона: • +375 17 306-00-57 • +375 29 550-09-52 • + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении очередного открытого аукциона по продаже объектов недвижимости в Пинском районе

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | **Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44176 «Коровник с молочным блоком», капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44177 «Дом животновода»** |
| **Местонахождение объекта** | 225734, Республика Беларусь, Брестская область, Пинский район, Загородский с/с, 2, 2/1, юго-восточнее деревни Вяз |
| **Продавец объекта** | ОАО «Новодворское-агро» |
| **Тип помещения** | Отдельно стоящие |
| **Общая площадь (кв.м)** | 1722,7 м², 47,6 м² |
| **Начальная цена (рублей)** | 281 612 000 |
| **Сумма задатка (рублей)** | 14 080 600 |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка** | «Коровник с молочным блоком» – здание специализированное животноводства, «дом животновода» – здание специализированное иного назначения, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 125483700001000026 общей площадью 4,5467 га. |
| **Организатор аукциона** | ОАО «Новодворское-агро», УНН 290481563, 225735, Брестская обл., Пинский район, д. Чухово, ул. Полесская, 1а. Тел./факс (0165) 39-81-10, мтс 80333991260. |

**Аукцион состоится 14 октября 2015 года в 10.00 по адресу: 225735, Брестская обл., Пинский район, д. Чухово, ул. Полесская, 1а.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 30 сентября 2015 года по 12 октября 2015 г. включительно по рабочим дням с 9.00 до 12.00.**

Дополнительная информация опубликована в газете «ЗВЯЗДА» №145 от 01.08.2015, № 169 от 04.09.2015, №178 от 17.09.2015.

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,

**опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. №16 строительство 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Смоговский тракт г. Минск:**

«...стоимость 1 кв.м квартир общей площадью **63,62 кв.м** составляет **1250** (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.»

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704, тел. 8 (017) 306-20-90 пн–пт (9.00–18.00, обед 13.00–14.00).**

УНП 101019973

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## СТРОИТЕЛЬСТВА ОБЪЕКТА

## «Строительство группы жилых домов неповышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной». Дом № 1 по генплану (2-я очередь строительства)

**Информация о застройщике:** «Приорбанк» Открытое акционерное общество («Приорбанк» ОАО), зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь 12 июля 1991 г., регистрационный номер 12.

Юридический адрес и местонахождение: 220002, г. Минск, ул. В.Хоружей, 31А.

Режим работы: понедельник – четверг с $8^{30}$ до $17^{30}$, пятница с $8^{30}$ до $16^{15}$, обеденный перерыв с $12^{30}$ до $13^{15}$, выходные дни – суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни.

В течение трех предшествующих лет «Приорбанк» ОАО как заказчик принял участие в строительстве следующих объектов недвижимости:

в 2015 году – «многоквартирный жилой дом № 2 по генплану в составе объекта «Строительство группы жилых домов неповышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина — Л. Беды — Белинского — Восточной, 1-я очередь строительства», г. Минск».

**Информация об объекте строительства.**

**Цель строительства:** исполнение условий заключенного с Минским городским исполнительным комитетом договора от 12 октября 2009 г. № 258-Д на реализацию права проектирования и строительства группы жилых домов неповышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Этапы и сроки реализации объекта строительства:** первый пусковой комплекс строительства – общестроительные работы жилой части здания секции 5, 6, 7, 8, техническое подполье всего здания, технический этаж секции 5, 6, 7, 8, отделка мест общего пользования, сантехнические, электромонтажные, пусконаладочные и отделочные работы жилой части секции 5, 6, 7, 8 в полном объеме согласно проектной документации, наружные стены и технические помещения встроенных помещений под данными секциями, несущие конструкции и перекрытие пристроенной гараж-стоянки для организации дворовой территории; второй пусковой комплекс строительства – общестроительные работы жилой части здания секции 1, 2, 3, 4, технический этаж секции 1, 2, 3, 4, отделка мест общего пользования, сантехнические, электромонтажные, пусконаладочные и отделочные работы жилой секции 1, 2, 3, 4 в полном объеме согласно проектной документации, наружные стены и технические помещения встроенных помещений под данными секциями, несущие конструкции и перекрытие пристроенной гараж-стоянки для организации дворовой территории; третий пусковой комплекс строительства – гараж-стоянка общей площадью 6328,54 квадратного метра; четвертый – четырнадцатый пусковые комплексы строительства – административно-торговые помещения 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 общей площадью 2734,87 квадратного метра.

Первый пусковой комплекс строительства: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – апрель 2016 г.

Второй – четырнадцатый пусковые комплексы: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – май 2017 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертные заключения от 6 августа 2010 г. № 895-15/10 и от 4 февраля 2015 г. № 67-15/15, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

**Разрешение на производство строительно-монтажных работ:** разрешение на производство строительно-монтажных работ от 25 марта 2015 г. №2-207Ж-001/15, выданное инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску.

**Местонахождение объекта строительства**: г. Минск, Советский район, в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Характеристика объекта строительства**: жилой дом состоит из 8 жилых секций, из которых 1, 5, 8 – 10-этажные и 2, 3, 4, 6, 7, 12-этажные. Конструктивная схема здания – монолитный каркас с шагами колонн от 2,3 м до 7,2 м со сплошными плоскими монолитными перекрытиями толщиной 200 мм. Здание с теплым техническим чердаком и техническими надстройками, в которых расположены машинные помещения лифтов и венткамеры подпора воздуха. Под домом запроектировано техническое подполье, в котором размещаются тепловые пункты, насосная пожаротушения, ЛВС. Техподполье имеет три самостоятельных выхода. Высота технического подполья 2,3 м обусловлена возможностью подключения здания к наружным сетям. Общая площадь квартир: однокомнатных от 43,15 до 54,09 кв.м; двухкомнатных от 63,51 до 78,39 кв.м; трехкомнатных от 83,48 до 100,02 кв.м. Количество квартир на этаже – 4. Высота жилого этажа от пола до пола – 3 м. Во всех квартирах запроектировано устройство летних помещений (остекленных лоджий и балконов). В квартирах, расположенных на 6 этаже и выше, в качестве второго эвакуационного выхода приняты выходы на лоджии и балконы с глухими простенками шириной 1,2 м. На 1-м этаже расположены встроенные административно-торговые помещения 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 общей площадью 2734,87 квадратного метра с входами со стороны основных транспортных и пешеходных потоков. Для маломобильной группы населения при входах в эти помещения предусматриваются пандусы. Входы в жилье осуществляются со стороны дворовой территории. На первом этаже 8-й секции предусмотрены помещения товарищества собственников. Естественное освещение обеспечивается нормативным удалением дома от прилегающей застройки с учетом инсоляции, а также оптимальным соотношением площадей окон к площадям помещений. Дом оборудован лифтами, мусоропроводом. Кровля плоская с внутренним водостоком. Окна – из ПВХ-профиля с двухкамерными стеклопакетами. Под дворовой территорией предусмотрено размещение подземного одноэтажного гаража-стоянки на 181 машино-место. Объемно-планировочное решение гаража-стоянки предусматривает устройство двух отсеков на 91 и 90 машино-места, разделенные противопожарной преградой с тамбур-шлюзом между ними. Каждый отсек имеет два выезда – один непосредственно наружу, второй – через соседний отсек. Выходы для людей предусмотрены через лестничные клетки и по въездным пандусам. В жилом доме предусмотрена аварийная противодымная вентиляция для удаления дыма при пожаре из коридоров и подача наружного воздуха из шахты лифтов. Вентиляция: в квартирах – естественная; во встроенных помещениях – естественная и механическая. Электроснабжение: разводка электропроводки с установкой электросчетчиков по квартирам и встроенным помещениям. Холодное и горячее водоснабжение: в квартиры и встроенные помещения устанавливаются счетчики холодной и горячей воды, регуляторы давления и устройства пожаротушения. Отопление: в квартирах – двухтрубная система отопления с установкой радиаторов и счетчиков учета тепла для каждой квартиры; во встроенных помещениях – горизонтальная однотрубная система отопления с установкой радиаторов и теплосчетчиков для каждой организации, потребляющей тепло. Телефонизация, радиофикация, телевидение: поквартирная разводка. Внутренняя отделка только мест общего пользования (общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы). Внутренняя отделка жилых помещений и встроенных помещений: стены, потолки, полы – без чистовой отделки. Дверные блоки: наружные – металлические; межквартирные – деревянные; межкомнатные – не устанавливаются.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства:** первый пусковой комплекс строительства – 23 единицы; второй пусковой комплекс строительства – 6 единиц; 10 машино-мест.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц следующие квартиры первого пускового комплекса строительства: однокомнатные квартиры – 5 единиц; двухкомнатные квартиры – 8 единиц; трехкомнатные квартиры – 10 единиц.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц следующие квартиры второго пускового комплекса строительства: двухкомнатные квартиры – 3 единицы; трехкомнатные квартиры – 3 единицы.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц 10 машино-мест.

**Цены на объекты долевого строительства:**

первый пусковой комплекс строительства: стоимость 1 (одного) квадратного метра **однокомнатных** квартир при внесении 100% оплаты в течение месяца с момента заключения договора составляет **20 500 000** (двадцать миллионов пятьсот тысяч) рублей. Стоимость 1 (одного) квадратного метра **двухкомнатных** квартир при внесении 100% оплаты в течение месяца с момента заключения договора составляет **19 800 000** (девятнадцать миллионов восемьсот тысяч) рублей. Стоимость 1 (одного) квадратного метра **трехкомнатных** квартир при внесении 100% оплаты в течение месяца с момента заключения договора составляет **19 500 000** (девятнадцать миллионов пятьсот тысяч) рублей;

второй пусковой комплекс строительства: стоимость 1 (одного) квадратного метра **двухкомнатных** квартир при внесении 100% оплаты в течение месяца с момента заключения договора составляет **19 300 000** (девятнадцать миллионов триста тысяч) рублей. Стоимость 1 (одного) квадратного метра **трехкомнатных** квартир при внесении 100% оплаты в течение месяца с момента заключения договора составляет **19 000 000** (девятнадцать миллионов) рублей;

стоимость 1 (одного) машино-места составляет **330 000 000** (триста тридцать миллионов) рублей. Первоначальный взнос – 20%. Оставшиеся платежи равными частями не позднее мая 2017 г.

Формирование стоимости квадратного метра вышеназванных квартир производится на основании сводного сметного расчета с учетом затрат застройщика.

**Условия оплаты:** при заключении договора дольщик вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата для всех категорий участников долевого строительства составляет 100% от стоимости квартиры (цены договора) и должна быть внесена не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Первоначальный взнос для всех дольщиков составляет не менее 20% от стоимости машино-места (цены договора) и должен быть внесен не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата по договорам создания объекта долевого строительства будет осуществляться в белорусских рублях.

**Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке:** в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 4 декабря 2014 г. № 3079 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства объекта». Свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права на него от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7546; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7547; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7548; от 18 декабря 2014 г. № 500/1109-7550.

**Площадь и границы земельного участка:** земельный участок площадью 2,2393 га расположен в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Элементы благоустройства:** комплекс работ по благоустройству включает устройство подъездов, пешеходных связей, установку малых архитектурных форм, озеленение, организацию детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок, площадок для отдыха взрослых.

**Количество в строящемся объекте строительства самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода объекта строительства в эксплуатацию:** общее количество квартир – 327, в том числе: однокомнатные – 54 единицы; двухкомнатные – 128 единиц; трехкомнатные – 145 единиц. Общее количество встроенных общественно-торговых помещений – 11 единиц. Общее количество машино-мест – 181 единица.

**Общее имущество объекта строительства, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта строительства в эксплуатацию и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и вентиляционные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, сантехническое, электрическое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их деятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в собственность дольщиков, если финансирование этих объектов осуществлялось дольщиками, и передаются застройщиком товариществу собственников.

**Предполагаемый срок ввода объекта строительства в эксплуатацию:** окончание строительства – 9 мая 2017 г.

**Договор строительного подряда:** договор строительного подряда от 29 декабря 2014 г. № 03.01-05/7 заключен застройщиком с ОАО «Стройтрест № 35».

**Условия приема заявлений и ознакомления с объектом долевого строительства:** прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться через 5 календарных дней после опубликования проектной декларации по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3. Прием заявлений осуществляется до момента набора их необходимого количества. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик вправе заключить договор с другим претендентом. Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – частное риэлтерское унитарное предприятие «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс» (Частное предприятие «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс»), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3 или по телефону: 8 (017) 292 42 19.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя №4



■ Вяртаючы з небыцця

# Апошні дзікі бык Еўропы

## Ці змогуць зубры выжыць без дапамогі чалавека?

**Агульнавядомы факт: у пачатку мінулага стагоддзя сучаснікі маманта знаходзіліся на мяжы поўнага знікнення. Апошні вольны зубр Белавежскай пушчы быў забіты ў 1919 годзе. З таго часу пачалася карпатлівая праца па аднаўленні рэдкага віду. Толькі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя першыя вольныя статкі зуброў зноў з'явіліся ў Белавежскай пушчы. Зараз у Беларусі налічваецца 1363 зубры. Гэтая лічба дазваляе казаць аб тым, што рэдкі звер адраджаецца. Аднак яго існаванне залежыць ад чалавека, без дапамогі якога зубр дэградуе і знікне. З якімі праблемамі сутыкаюцца беларускія спецыялісты, што займаюцца аднаўленнем папуляцыі «волатаў»? І як сёння пачуваецца апошні дзікі бык Еўропы?**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### НАШЧАДАК ПЕРШАБЫТНАГА БІЗОНА

Узгадаем радавод зубра. У эпоху плейстацэну на тэрыторыі Еўразіі пражываў першабытны зубр, вядомы як стэпавы бізон. З часам ён дабраўся да Паўночнай Амерыкі, дзе даў жыццё новаму віду — амерыканскаму бізону, брату нашага зубра. Еўрапейскі зубр і амерыканскі бізон пасля раздзяліліся на падвіды: горны каўказскі і нізінны еўрапейскі — нашчадкі еўрапейца, стэпавы і лясны — «дзеці» амерыканца.

Зубр здаўна быў жаданай здабычай для любога паляўнічага, але апетыты і азарт чалавека прывялі да таго, што звер стаў знікаць. Першы трывожны сігнал паступіў з Брытанскіх астравоў, потым магутнага быка не стала ў лясах Заходняй Еўропы. На пачатку XX стагоддзя засталіся толькі дзве папуляцыі — белавежская нізіннага падвіду і горная каўказская. У лютым 1919 года былі знішчаны апошнія вольныя зубры белавежскай лініі, а ў 1927 годзе пастухі адстрэлілі апошніх «каўказцаў». Нізінных зуброў пачалі аднаўляць ад сямі асобін, якія захаваліся ў заапарках. Каўказскай лініі не пашанцавала, бо ад яе застаўся толькі бык Каўказ. Яго сталі скрыжоўваць з белавежскімі самкамі. Так з'явілася змяшаная белавежска-каўказская лінія, «пачынальнікамі» якой сталі 12 зуброў.

### СЛАБЫЯ ГЕНЫ МОЦНАГА ЗВЕРА

Трэба адзначыць, што амерыканскаму брату-бізону таксама хапіла: на іншым кантыненце паляўнічыя за каштоўнымі скурамі масава вынішчалі жывёл. Аднак у ЗША своечасова спахапіліся, што звер знікае (у канцы XX стагоддзя ў ЗША засталося менш за тысячу бізонаў), і навукоўцы заняліся выратаваннем папуляцыі. Праблема блізкароднаснага скрыжоўвання (інбрыдынгу) бізонаў не закранула, аднак у выпадку з зубрамі яна была непазбежная. Такое размнажэнне стала прычынай розных рэцэсіўных захворванняў жывёл. Навукова даказана, што ў адноўленых белавежскіх зуброў слабы імунітэт.

— У канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя ў самцоў зубра белавежскай лініі (найбуйнейшай на той момант) праявілася захворванне мочапалавой сістэмы — баланапасціт, — распавядае **навуковы супрацоўнік лабараторыі тэрыялогіі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах Павел ВЕЛІГУРАЎ.** — Хвароба прыводзіла да бясплоднасці і нават смерці жывёл. Узбуджальнікамі з'яўляюцца ўмоўна патагенныя мікраарганізмы і вірусы. Пры добрым імунітэце яны не пагражаюць арганізму, затое пры слабым вірусы здольны выклікаць сур'ёзнае захворванне.

Маштабы эпідэміі баланапасціту ў канцы 80-х гадоў былі настолькі вялікімі, што вучоныя ўсур'ёз задумаліся аб магчымым выміранні белавежскай папуляцыі. Вылечыць зуброў не ўдалося, і хворых самцоў давялося адстрэльваць, каб яны далей не распаўсюджвалі інфекцыю. Тады спецыялісты вырашылі рассяліць звера па невялікіх папуляцыях: на выпадак, калі белавежская папуляцыя знікне, будуць «запасныя».

**(Заканчэнне на 8-й стар.)**

■ Далёкае-блізкае

# БЯСПЕЧНЫ «ХОЛАД»

## Айчынныя прадпрыемствы адмаўляюцца ад выкарыстання фрэонаў

**Выбіраючы халадзільнік, вы наўрад ці задумваецеся, які холадагент у ім выкарыстоўваецца. Тэхніка «марозіць» дзякуючы фрэонам альбо гідрахлорфторвугляродам (далей — ГХФВ). Праўда, ёсць у гэтых рэчывах адзінае «але»: яны разбураюць азонавы слой атмасферы, тым самым падвяргаюць паверхню планеты ўздзеянню ультрафіялетавых сонечных промняў. Менавіта таму прадпрыемствы паступова адмаўляюцца ад выкарыстання фрэонаў і пераходзяць на больш экалагічныя тэхналогіі. Як гэта адбываецца ў Беларусі?**

Самая вялікая работа ў гэтым кірунку была праведзена на Мінскім заводзе халадзільнікаў ЗАТ «АТЛАНТ». Да 1993 года тут выпускалі халадзільнае абсталяванне, якое працавала на фрэонах R-12 і R-11. У пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя на прадпрыемстве была распрацавана праграма па вывадзе азонаразбуральных рэчываў. Іх замянілі на менш шкодныя ГХФВ R-134a. Ужо з 2002 года «Атлант» пачаў выпускаць халадзільнікі і маразільнікі з бяспечным холадагентам R-600a (ізабутан). Для запраўкі сабранага агрэгата патрабуецца ўсяго 40-80 грамаў газу. Спецыялісты адзначаюць: прыродны газ ізабутан з'яўляецца пажаранебяспечным. Пераход з аднаго холадагента на іншы даўся няпроста.

Запраўка халадзільніка ізабутанам.

— Ізабутан і R-134a — гэта прынцыпова розныя кампаненты. Замяніць адзін другім немагчыма, бо першы з іх з'яўляецца прыродным растваральнікам, у другога такіх якасцяў няма, — распавядае **галоўны канструктар бытавой тэхнікі ЗАТ «Атлант» Канстанцін СЯРЖАНАЎ.** — Большая частка абсталявання можа працаваць на адноўленым хладоне альбо павінна быць выведзена з эксплуатацыі. Дзякуючы супрацоўніцтву з навукоўцамі мы за два гады цалкам змянілі тэхналогію.

### Як праводзіцца ўтылізацыя холадагентаў?

— У 1993 годзе прадпрыемства атрымала абсталяванне для рэцыклінгу і збору фрэонаў, якія выкарыстоўваліся доўгі час. Нашы спецыялісты аднаўлялі гэтыя рэчывы і запраўлялі іх у халадзільнікі паўторна, — адзначае **кіраўнік бюро экалагічнага кантролю «Атланта» Вадзім МІКУЛІЧ.** — Апошні раз мы аднаўлялі фрэон у 2012 годзе. Аднак, калі ёсць патрэба, мы можам забраць стары фрэон і аднавіць яго на вытворчасці ды паўторна заправіць у халадзільнік спажыўца. Дарэчы, калі стары халадзільнік перастае марозіць, даю 95%: у сістэме з'явілася «дзірка», праз якую газ вылецеў.

Апісваючы сітуацыю з фрэонамі ў Беларусі, спецыялісты адзначаюць: у краіне ствараюцца ўмовы для таго, каб выкарыстанне шкодных рэчываў скарачалася.

— У нас уведзена падатковая плата за ўвоз азонаразбуральных рэчываў. Кожны кілаграм фрэонаў «каштуе» прыкладна 80 тысяч беларускіх рублёў, што, адпаведна, дадаецца да кошту тавару, — адзначыла **кансультант аддзела рэгулявання ўздзейнічання на атмасфернае паветра і азонавы слой Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольля Наталля КЛІМЕНКА.** — Заправіць халадзільнік азонаразбуральным рэчывам выйдзе даражэй, чым бяспечным газам.

Нагадаем: Беларусь узяла на сябе абавязацельствы Манрэальскага пратакола па рэчывах, якія разбураюць азонавы слой. У 2020 годзе наша краіна цалкам адмовіцца ад спажывання фрэонаў: гэта азначае, што ГХФВ больш не будуць да нас увозіцца. За апошнія пяць гадоў іх спажыванне ў Беларусі скарацілася на 40%, што сведчыць пра пэўны прагрэс у гэтай галіне.

### Экалагічная эканомія

Цяпер у Беларусі рэалізуецца праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду (ГЭФ) «Садзейнічанне ў рэалізацыі паскоранага вываду з ужытку гідрахлорфторвугляродаў у краінах з пераходнай эканомікай». У яго рамках на мінулым тыдні на Давыд-Гарадоцкім электрамеханічным заводзе было ўведзена новае абсталяванне для ачысткі і прамыўкі дэталяў пускавога і ахоўнага рэле, якімі камплектуюцца халадзільнікі і маразільнікі «Атланта». У працэсе ачышчэння дэталяў задзейнічаны альтэрнатыўныя азонабяспечныя растваральнікі.

У 1995 годзе «Атлант» набыў патрыманае японскае абсталяванне для абястлушчвання дэталяў, якое пасля было перададзена ў Давыд-Гарадок. У якасці растваральніку выкарыстоўвалася азонаразбуральнае рэчыва — ГХФВ-141b. Старое абсталяванне ў хуткім часе знасілася, таму ў апошнія гады дэталі прамываліся ўручную ў адкрытых ёмістасцях. Пры гэтым вялікая колькасць азонаразбуральнага растваральніку папросту выпаралася, і прадпрыемства губляла каля 7 тон рэчыва за год. Да таго ж гэта не дазваляла выконваць экалагічныя і санітарныя нормы. Дзякуючы праекту на заводзе з'явілася дыстыляцыйная ўстаноўка для рэцыклінгу растваральнікаў і ўстаноўка для ўльтрагукавой паравой ачысткі/абястлушчвання механічных дэталяў.

— Абсталяванне дазволіць нам працаваць без уцечак азонаразбуральнага рэчыва, а эканомія складзе каля 600 мільёнаў рублёў за год, — адзначыў **дырэктар прадпрыемства Эдуард СЦЯПУРА.**

— Для краіны гэта другі вялікі праект, які рэалізуецца за сродкі ГЭФ: першы быў звязаны з вывадам хладонаў R-11 і R-12, рэалізаваны ў сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Адзначу, што Беларусь пайшла па шляху стварэння цэласнай сістэмы: мы робім дэманстрацыйныя праекты, закупляем кантрольнае абсталяванне, ствараем сістэму для рэцыклінгу адпрацаваных фрэонаў, займаемся падрыхтоўкай кваліфікаваных спецыялістаў. У краіне будуць створаны чатыры цэнтры па рэцыклінгу і аднаўленні азонаразбуральных рэчываў, — расказаў **кіраўнік упраўлення рэгулявання ўздзейнічання на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Мінпрыроды Сяргей ЗАЎЯЛАЎ.** — Яшчэ адным дасягненнем краіны ў гэтым кірунку я лічу стварэнне «Асацыяцыі прадпрыемстваў індустрыі мікраклімату і холаду», якая аб'яднала ў сабе ўсе буйныя кампаніі па гэтай тэматыцы.

**Кацярына РАДЗЮК**

■ Экалагічны лікбез

## КАБ АДХОДЫ НЕ ПРЫБАВІЛІ РАСХОДАЎ

**Адпрацаванае машыннае масла і змазачныя матэрыялы пры няправільным выкарыстанні часта становяцца пагрозай для чалавека і жывога свету. Трапляючы ў навакольнае асяроддзе, яны ўтвараюць вельмі ўстойлівыя забруджванні і прыводзяць да дэградацыі асобных прыродных кампанентаў.**

На жаль, пра гэта часта «забываюцца» шматлікія кампаніі і арганізацыі, у выніку дзейнасці якіх і ўтвараюцца нафтаўтрымліваючыя адходы. Толькі за бягучы перыяд 2015 года падчас праверак суб'ектаў гаспадарання органы Мінпрыроды выявілі больш за 250 парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства ў гэтай вобласці, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты больш за 80 вінаватых асоб на суму, большую за 160 млн рублёў.

Так, падчас праверкі на адным з прадпрыемстваў нафтаперапрацоўчай прамысловасці Гомельскай вобласці было выяўлена перавышэнне нарматываў дапушчальных канцэнтрацый па ўтрыманні нафтапрадуктаў у глебе на тэрыторыі парка захавання сырой нафты. Прычынай забруджвання стаў выхад са строю тэхналагічнага абсталявання пры правядзенні рамонтных работ.

Па патрабаванні экалагічнай службы прадпрыемства выдаліла забруджаны грунт, зрабіла планаванне гэтай тэрыторыі і падсыпала яе прывазным грунтам, а таксама кампенсавала шкоду, нанесеную навакольнаму асяроддзю, сума якой склала больш за 15 млн беларускіх рублёў.

**Спецыялісты ўпэўнены: да такога і падобных парушэнняў звычайна прыводзяць элементарнае няведанне патрабаванняў дзейнага заканадаўства, безгаспадарчасць і незацікаўленасць пытаннямі аховы навакольнага асяроддзя.** Нафтаўтрымліваючыя адходы часта не ўключаюцца ў інструкцыю па абыходжанні з адходамі, не заключаюцца дамовы на іх перапрацоўку. Адсутнічаюць цэнтралізаваныя месцы збору такіх адходаў, у выніку чаго яны няправільна захоўваюцца, выпарваюцца ці іншым чынам трапляюць у навакольнае асяроддзе, выклікаючы дэградацыю яго кампанентаў. Але ўсе гэтыя патрабаванні прапісаны ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб абыходжанні з адходамі».

Але штрафы — не адзіны від пакарання такой «забыўлівасці». Прадпрыемствам прамысловасці, сельскай гаспадаркі і арганізацыям, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю і рамонт аўтатранспарту (а менавіта гэтыя суб'екты гаспадарання часцей трапляюць у спіс парушальнікаў), неабходна таксама кампенсаваць шкоду, якую яны нанеслі прыродзе. Так, за забруджванне кампанентаў навакольнага асяроддзя адходамі нафтапрадуктаў вінаватым сёлета давялося заплаціць у агульнай суме 500 млн руб.

Некаторыя арганізацыі дагэтуль выкарыстоўваюць адпрацаванае масла і змазачныя матэрыялы ў якасці паліва, парушаючы нормы закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове атмасфернага паветра» і Тэхнічнага кодэкса ўстаноўленай практыкі ТКП «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Адходы. Правілы выкарыстання вуглевадародутрымліваючых адходаў у якасці паліва».

***У адпаведнасці з артыкулам 31 закона «Аб ахове атмасфернага паветра», спальванне паліва, рэчываў, якія выкарыстоўваюцца ў якасці паліва, у месцах і (або) прыладах, не прызначаных для спальвання паліва, не дапускаецца. Спальванне рэчываў, якія не з'яўляюцца палівам, або сумесі рэчываў, матэрыялаў і адходаў забараняецца, акрамя выпадкаў, калі спальванне ажыццяўляецца з выкарыстаннем спецыяльных прылад і выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя, у тым ліку аб абыходжанні з адходамі.***

Каб не стаць ахвярай уласнай абыякавасці і недасведчанасці, суб'ектам гаспадарання трэба добра ведаць заканадаўства ў вобласці абыходжання з нафтаўтрымліваючымі адходамі і выконваць усе яго нормы. Тады, магчыма, і штрафаў удасца пазбегнуць.

**Сцяпан ДУБНІЦКІ,**
**начальнік упраўлення каардынацыі кантрольнай дзейнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**

# Апошні дзікі бык Еўропы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### АД КОЛЬКАСЦІ — ДА ЯКАСЦІ

Прадумваючы тактыку выратавання зубра, беларускія вучоныя вырашылі выкарыстаць вопыт амерыканскіх эколагаў Майкла Сулея і Бруса Уілкакса аб метапапуляцыйнай мадэлі захавання віду. Яе сутнасць наступная: для кароткатэрміновага існавання папуляцыі неабходна як мінімум 50 эфектыўных (здольных да размнажэння) асобін, для доўгатэрміновага — не менш за 500. Спецыялісты падлічылі, што з улікам маладняку і старых жывёл папуляцыя мусіць складаць каля 1500 асобін. Аднак для такога вялікага статка ў Еўропе, а тым больш у Беларусі, прыдатнай тэрыторыі няма. Таму вырашылі трымаць зуброў у невялікіх «сем'ях».

— Калі праводзіць генетычныя абмены паміж субпапуляцыямі, біялагічная разнастайнасць будзе вышэйшай за кошт таго, што рэдкія гены не разбавяцца ў вялікай папуляцыі, — тлумачыць Павел Велігураў.

У 1965 годзе была створана першая папуляцыя вольных зуброў — белавежская. У 1970-я з'явіліся яшчэ дзве — азяранская і бярозаўскабарысаўская. З гадамі ўзнікалі новыя мікрапапуляцыі, сёння налічваецца ўжо 10 «мікрасем'яў», вядзецца праца па адзінаццатай, дзятлаўскай. Аднак у Беларусі можна знайсці яшчэ хіба 2-3 месцы для прапіскі чырванакніжніка.

— Мы плануем перайсці ад павелічэння колькасці зуброў да фарміравання жыццяздольнага статка, — адзначае **генеральны дырэктар Нацыянальна-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах Алег БАРАДЗІН.** — Атрымаць статус дзікага, незалежнага ад чалавека віду еўрапейскі зубр зможа няхутка.

Метапапуляцыйная мадэль па захаванні зубра рэалізуецца ў Беларусі, Польшчы, Расіі і Украіне. Спецыялісты краін Заходняй Еўропы пайшлі іншым шляхам: яны трымаюць жывёл у заапарках і вальерах. Практыка прыносіць добрыя вынікі: у Германіі, напрыклад, налічваецца больш за 400 зуброў — гэта чацвёртая па колькасці папуляцыя ў свеце. Дарэчы, жывёлы з Еўропы да нас не трапляюць, хутчэй, наадварот — Беларусь прадае зуброў. За мінулы і пачатак гэтага года 20 асобін былі прададзены ў Казахстан — на новую для волата тэрыторыю.

### ЧЫРВАНАКНІЖНІК ЦІ ТРАФЕЙ?

Разважаючы над «жыллёвым пытаннем» зубра, вучоныя вырашылі, што звера можна пасяліць не толькі на ахоўваемых прыродных тэрыторыях, але і на землях агульнага гаспадарчага карыстання. Так ён прапісаўся ў паляўнічых гаспадарках, вопытным лясгасе, сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве.

Усе зубры належаць да асноўнага альбо да рэзервовага генафонду. У першым значацца жывёлы з добрымі фізічнымі якасцямі — каштоўныя для селекцыі экзэмпляры. Паляванне на іх забаронена. У рэзерв трапляюць старыя, хворыя, траўмаваныя, жывёлы з пашкоджаннямі, небяспечнымі для жыцця, з адхіленнямі, маладыя самцы, якія былі выгнаны са статка падчас яру, мігравалі на адлегласць, большую за 50 км, і не вярнуліся цягам трох месяцаў. У гэтую групу зуброў адбіраюць, альбо, калі казаць мовай навукі, выбракоўваюць.

Для аптымізацыі колькасці зуброў прадугледжваецца адстрэл нежыццяздольных жывёл. У грамадскасці паляванне на волатаў выклікае абурэнне, аднак, на думку спецыялістаў, гэта неабходная мера: нормы аптымальнай колькасці ў некаторых субпапуляцыях значна перавышаны, што прыводзіць да пэўных праблем. Так, прадстаўнікі рагатага статка, акрамя сваіх прыродных «сталовак», часта наведваюцца на сельскагаспадарчыя ўгоддзі, прыватныя падворкі. Напрыклад, у 2008 годзе зубры асіповіцкай папуляцыі нанеслі шкоды больш чым на 5000 долараў: жывёлы выходзілі з лесу на палі з пшаніцай і жытам і літаральна за тыдзень знішчалі да 60 га угоддзяў: што не елі, тое вытоптвалі.

Па зубрыныя трафеі ў Белавежскую пушчу прыязджаюць расіяне, іспанцы, немцы, туркі. Кошт розны — ад 5 да 20 тысяч еўра. Паляванне вядзецца не вельмі актыўна: у год адстрэльваецца ад 5 до 10 некандыцыйных асобін (у рэзервовы фонд трапляюць ад 8 да 10 асобін).

### ХТО ПРЫМЕ БЕЛАРУСКІХ ЗУБРОЎ?

Алег Барадзін падкрэслівае, што праца па захаванні еўрапейскага зубра немагчыма без міжнароднага супрацоўніцтва. Некалькі гадоў таму расійскія і беларускія вучоныя дамовіліся аб стварэнні ўстойлівых папуляцый і аднаўленні ранейшага арэала зубра. Беларусь ініцыявала распрацоўку праграмы Саюзнай дзяржавы «Аднаўленне зубра ў дзікай прыродзе (Дарожная карта для зубра) на 2016—2020 гг.». Меркавалася, што на тэрыторыі суседняй дзяржавы будуць рассяляцца буйныя групоўкі зуброў, якім у нас стала цеснавата. Распрацоўка канцэпцыі праграмы і яе ўзгадненне вяліся на працягу некалькіх гадоў. «Аднак фінансавыя органы Расійскай Федэрацыі не палічылі магчымым рэалізаваць праграму ў рамках Саюзнай дзяржавы. Такім чынам, па ініцыятыве расійскіх калег яна была адменена», — адзначыла **кіраўнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталля МІНЧАНКА.**

Зараз Беларусь наладжвае кантакты з польскімі і літоўскімі калегамі, і такое супрацоўніцтва цалкам лагічнае, бо Беларусь і Польшча з'яўляюцца асноўнымі трымальнікамі зубровых статкаў. «Мы хочам аб'яднаць намаганні для дасягнення агульнай мэты — захаванне зубра. Наша галоўная задача — правесці генетычныя даследаванні і выбраць найбольш каштоўных жывёл з пункту гледжання іх далейшага ўзнаўлення», — адзначыла прадстаўнік Мінпрыроды.

Фінансаванне мерапрыемстваў па захаванні і рацыянальным выкарыстанні зубра ажыццяўляецца ў рамках плана, распрацаванага на 2015—2019 гады і ўзгодненага ўрадам краіны. Прадугледжваецца выдаткаваць больш за 12 млрд рублёў як з дзяржаўнага бюджэту, так і са сродкаў трымальнікаў мікрапапуляцый зуброў.

Зубр выратаваны ад вымірання. Аднак пакуль што залежны ад чалавека від патрабуе вялікіх укладанняў, як навуковых, так і матэрыяльных. Застаецца спадзявацца, што ў хуткім часе магутны бык зноў стане самастойным, моцным дзікім зверам, якім мы прывыклі сабе яго ўяўляць.

**Кацярына РАДЗЮК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

■ У свеце раслін

# АРЫСТАКРАТЫ ГРЫБНОГА ЦАРСТВА

**Менавіта так называюць труфелі — сумчатыя грыбы, якія ва ўсім свеце лічацца каштоўнымі далікатэсамі. Спытаеце, якія адносіны яны маюць да нас? Аказваецца, незвычайныя грыбы растуць і ў беларускіх лясах.**

У адрозненне ад сваіх сабратаў, труфелі — грыбы падземныя, яны растуць на глыбіні да 30 см у ліставых лясах і ўтвараюць мікарызу (сімбіёз) з каранямі дрэў. Іх можна адрозніць па акруглай ці клубнепадобнай форме і мясістай ці храстковай кансістэнцыі.

Чатыры віды труфеляў, выяўленых на тэрыторыі краіны, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Ушчыльненне і забруджванне глебы, высечка лясоў, збор і пашкоджванне пладовых целаў і іншае антрапагеннае ўздзеянне прывялі да іх амаль поўнага знікнення.

**Труфель чырвона-буры** вырастае да 3 см у велічыню. Абалонка гэтага ядомага грыба мае бураваты колер з шакаладным адценнем, мякаць ружавата-бурая, са шматлікімі хвалістымі вонкавымі венамі.

Арэал віду ахоплівае Еўропу і Азію, у Беларусі вядома толькі адно месцазнаходжанне — у Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці (тэрыторыя нацыянальнага парку «Прыпяцкі»). Чорна-буры труфель «сяброуе» з дубам, грабам, елкай і выспявае ў жніўні-верасні адзінкавымі экзэмплярамі ці невялікімі групамі.



Труфель летні.

Труфель чырвона-буры.

**Стэфензія атласная, ці труфель шаўкавісты** мае крыху меншы памер (да 2 см у дыяметры), расце ў змешаных і хвойных лясах з багатымі на перагной глебамі, утварае мікарызу з шыракалістымі пародамі дрэў і выспявае ў ліпені—верасні. Абалонка грыба светлая, крыху бураватая, амаль гладкая, мякаць белаватая, з лабірынтападобнымі хадамі.

У Беларусі гэтыя грыбы растуць на Міншчыне і ў Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці.

Магілёўшчына стала прытулкам і для **труфеля Борха.** Ён крыху большы за сваіх братоў — вырастае да 5,5 см у дыяметры, мае шчыльнамясістае пладовае цела з тонкай, гладкай абалонкай бруднавата-белага колеру і шчыльную белую мякаць. Пладаносіць грыб у жніўні-верасні. Акрамя Беларусі, ён ахоўваецца ў Польшчы.

Каштоўны, але рэдкі ядомы грыб **труфель летні** расце ў Белавежскай пушчы і ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці. Ён жыве ў лясах з ліставымі дрэвамі (дубам, букам, грабам, ляшчынай) і на багатых на перагной глебах. Выспявае звычайна ў чэрвені—жніўні.

Грыб мае акруглае ці клубнепадобнае пладовае цела дыяметрам 2-8 см. Яго абалонка — чорна-бурага колеру з вялікімі бародаўкамі. Мякаць — белая, шчыльнамясістая. Гэты від труфеляў спецыялісты раяць для ўвядзення ў культуру.

Па словах **Вольгі ГАПІЕНКІ, загадчыцы лабараторыі мікалогіі Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча НАН Беларусі**, культываванне труфеляў — каштоўных у кулінарыі і парфумерыі відаў грыбоў — у краінах Еўропы развіта і пастаўлена на паток. У канцы XIX стагоддзя «труфельным промыслам» займаліся і ў Беларусі. Грыбы раслі ў Белавежскай пушчы і ў лясах па берагах Нёмана, праводзіліся нават іх нарыхтоўкі. Але сёння труфелі, на жаль, рэдкія госці мясцовых лясоў, у адрозненне ад такіх краін, як Францыя, Італія, Іспанія, Партугалія, Германія. Для росту і развіцця труфелепадобных грыбоў кліматычныя ўмовы ў Еўропе значна больш спрыяльныя, чым у нас.

— Да гэтай групы адносяцца і **труфель траецкі, ці труфель белы, аленевы труфель і два віды элафаміцэса — шыпаваты і пярэсты,** — расказала Вольга Гапіенка. — Гэтыя віды сустракаюцца крыху часцей, але іх колькасць недастатковая для правядзення актыўных збораў і тым больш нарыхтовак. Але са зменай клімату з'явіўся шанц для развядзення труфеляў у паўднёвых раёнах краіны — у дубровах з прымессю граба і бука.

**Вераніка КОЛАСАВА**

*Грыбнікі часта блытаюць труфелі з іншымі грыбамі, якія растуць звычайна на паверхні зямлі (у адрозненне ад сапраўдных труфеляў), маюць падобную форму, але зусім іншую ўнутраную будову. Гэта, напрыклад, рызапагон жоўты, ці несапраўдны труфель, які з'яўляецца неядомым і нават атрутным грыбам.*

*— Знайшоўшы ў лесе труфель, не спяшайцеся яго есці, — раіць Вольга Сцяпанаўна. — Лепш адразу праверыць знаходку ў лабараторыі мікалогіі нашага інстытута, каб не атруціцца.*

■ У свеце жывёл

# ПТУШКІ, У НЕБА!

**Надыход восені ў многіх з нас асацыюецца з адлётам птушак у вырай. Але, як сцвярджаюць спецыялісты, некаторыя прадстаўнікі птушынага царства пакідаюць свае гнёзды задоўга да халадоў.**

Фота Юрыя ГОРЫДА.

Як расказала **старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі арніталогіі НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Наталля КАРЛІЁНАВА**, такія віды кулікоў, як кулік-цякун, кулік-случок, кнігаўка, грыцук, пачынаюць рыхтавацца да адлёту ў цёплыя краіны яшчэ ў чэрвені. Яны аднымі з першых прылятаюць вясной на радзіму і рана пачынаюць гнездавацца. Бо шлях да месцаў зімоўкі для некаторых з іх — Афрыкі — няблізкі. Першымі адлятаюць дарослыя птушкі, каб пакінуць моладзі дастатковую колькасць корму. Яны паступова рухаюцца на поўдзень, прыпыняючыся ў найбольш спрыяльных месцах.

Увогуле, раней за іншых гнёзды пакідаюць насякомаедныя птушкі, якія з-за надыходзячых халадоў страчваюць свой асноўны корм. Так, у канцы жніўня адляцелі свіргулі (стрыжы), а таксама гарадская і берагавая ластаўкі. Але вось іх вясковая сваячка затрымалася — яна дагэтуль у вялікай колькасці сустракаецца на поўдні краіны, хоць звычайна ў гэты час можна ўбачыць толькі яе адзінкавыя экзэмпляры.

У канцы жніўня — пачатку верасня ў «адпачынак» адправіліся і драпежнікі: сокал-шулячок, сокал-кабец і інш., зараз ідзе актыўная міграцыя канюкоў.

**Феномен сёлетняй вясны — крылатыя мігранты з Еўропы прыляцелі вельмі рана, але гнездавацца пачалі ў свой звычайны тэрмін. Таму некаторыя віды птушак, напрыклад кулік-случок, «прагулялі» да пачатку гнездавання амаль два месяцы.**

Апошнімі Беларусь пакідаюць блізкія мігранты, якія зімуюць у Заходняй і Паўднёвай Еўропе: шпакі, берасцянкі, бакасы, жураўлі, некаторыя віды качак, крыўкі. У гэтыя верасняўскія дні, зірнуўшы на неба, можна заўважыць чароды жураўлёў, кнігавак, залацістых севак. Шпакі ж пакуль не спяшаюцца ў вырай. Навуковец лічыць, што гэта звязана з незвычайна цёплай восенню.

Хутка праз нашу краіну будуць ляцець і птушкі-суседзі, якія гнездаваліся на паўночным захадзе Расіі: слонкі, стучкі, сяўцы, турпаны, ныркі-сіньгі і крыжанкі. З беларускіх птушыных у кастрычніку-лістападзе можна будзе ўбачыць крыжанак з гарадскіх папуляцый, а таксама птушак, якія застаюцца на зімоўку.

Сёння ўжо не відаць і белых буслоў. Крылатыя сімвалы краіны ўжо даўно рушылі да сваіх афрыканскіх стаянак. Але некаторыя іх аслабленыя браты, на жаль, не змаглі адправіцца ў падарожжа. Ім давядзецца спадзявацца на лагодную зіму ці добрых людзей, якія падтрымаюць птушак у моцныя халады.

Але калі для буслоў корм амаль заўсёды знойдзецца, то іншыя птушкі, якія харчуюцца чарвякамі і насякомымі, зімой проста асуджаныя на пагібель. Выжываюць толькі тыя, што знаходзяць сабе цёплае месцейка ля вадаёмаў, якія не замярзаюць, ці паблізу цеплатрас. Так, адзінкавыя выпадкі зімоўкі куліка-перавозчыка, бакаса, слонкі рэгіструюцца ў заходніх Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. Па словах Наталлі Карліёнавай, на некаторых вадаёмах буйных гарадоў кожны год зімуюць папуляцыі крыжанак і лебедзяў. У халодную пару можна ўбачыць у сталіцы асобных пералётных птушак — чорных драздоў і малінавак. Чакаюць іх спецыялісты і сёлета. Як і гасцей з замежжа — амялушак, крыжадзюбаў, чачотак, рагатых жаўрукоў і сняжурак, якія мігруюць з поўначы.

«Наогул, птушкі добра адчуваюць кліматычныя змены і тое, што ў Беларусі клімат становіцца больш мяккім і цёплым», — упэўнена Наталля Карліёнава. Гэта паказваюць і даследаванні. Так, птушкі, якія зімуюць у Еўропе, за апошнія гады сталі раней прылятаць на радзіму вясной. Але гэта чуццё не распаўсюджваецца на афрыканскіх мігрантаў — яны з'яўляюцца ў небе Беларусі прыкладна ў адзін і той жа час, незалежна ад таго, ранняя ці позняя на радзіме вясна.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

■ Усё, што вы хацелі ведаць пра...

# КУДЫ ПАДЗЕЦЬ ПРАТЭРМІНАВАНЫЯ ЛЕКІ?

**Некалькі разоў на год мы папаўняем свае хатнія аптэчкі самым неабходным. Даволі часта многія прэпараты так і застаюцца ляжаць мёртвым грузам, пакуль іх тэрмін прыдатнасці не скончыцца. Старыя «лекі», пра якія проста забываем, пакідаючы абы-дзе, трапіўшы ў рукі дзяцей, могуць адправіць малых у рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы хуткай дапамогі... Што рабіць з медпрэпаратамі, калі яны ператварыліся ў адходы? Выкідваць у агульную сметніцу ці змываць у каналізацыю? Але ці бяспечнае гэтае «смецце» для навакольля?**

## ПАГРОЗЫ «ЛЯЧЭБНАЙ» ВАДЫ І ГЛЕБЫ

За год на аднаго жыхара Беларусі прыпадае каля 3 кг медыцынскіх і фармацэўтычных адходаў, большасць з іх (шпрыцы, кропельніцы, упакоўкі, сродкі дэзынфекцыі) Сусветная арганізацыя аховы здароўя адносіць да катэгорыі небяспечных. Пры гэтым насельніцтва краіны старэе, вытворчасць медыкаментаў, а разам з тым і рост медыцынскіх адходаў з кожным годам павялічваюцца.

— Асноўная праблема заключаецца ў самім існаванні фармацэўтычных прэпаратаў, — адзначае **супрацоўніца інфармацыйнага цэнтра па пытаннях хімічнай бяспекі і адходаў Цэнтра экалагічных рашэнняў (ЦЭР) Наталля БЛЫШЧЫК**. — Па выніках сацыялагічнага даследавання, праведзенага кампаніяй NOVAK, аказалася: беларусы набываюць больш медыкаментаў, чым ім патрэбна на самой справе. Звесткі за мінулы год сведчаць: на аднаго жыхара нашай краіны прыпала каля 35 упаковак пратэрмінаваных лекаў!

У медыцынскіх установах сістэма збору і ўтылізацыі фармацэўтычных адходаў наладжана, для насельніцтва яна пакуль не створана. З гэтай прычыны «тухлыя» мазі і таблеткі з хатняй аптэчкі адпраўляюцца проста ў сметніцу ці ў каналізацыю. А адтуль — у глебу і ваду. І вось вынікі: па ўсім свеце ў пітной вадзе знойдзена 25 фармпрэпаратаў і іх метабалітаў. Наяўнасць у вадзе гарманальных прэпаратаў негатыўна ўплывае на рэпрадуктыўную функцыю ў амфібій і рыб, прыводзіць да ныркавай недастатковасці ў птушак. Часам «лячэбная» вадкасць змяняе паводзіны жывёл: напрыклад, у печкуроў парушаюцца інстынкты самазахавання, таму яны лёгка становяцца здабычай драпежнікаў. Рэпрадуктыўныя таксіканты (супрацьзачаткавыя сродкі), трапляючы ў наваколле, могуць прывесці да парушэння рэпрадуктыўнай функцыі ў мужчын, у жанчын — да змянення цыкла авуляцыі, парушэння развіцця плода.

## ЯК УТЫЛІЗУЮЦЬ МЕДЫЦЫНСКІЯ АДХОДЫ?

Згодна з Законам «Аб леках» працэдура знішчэння праводзіцца над усімі няякаснымі прэпаратамі і тымі, тэрмін прыдатнасці якіх ужо скончыўся. У класіфікатары адходаў лекі ад насельніцтва не вылучаны ў асобную пазіцыю, яны лічацца адходамі спажывання.

У Беларусі большая частка адходаў спальваецца. Летась у Мінску адкрыўся комплекс па спальванні медыцынскіх адходаў. Яго кліенты — бальніцы, дыспансеры, фармацэўтычныя прадпрыемствы, аптэкі.

— Мы можам перапрацаваць каля 370 тон медыцынскіх адходаў за год, — расказвае **кіраўнік цэха па абясшкоджванні адходаў камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Экарэс» Руслан ХУРСІК**. — Спальванне праводзіцца ў два цыклы, працягласць аднаго складае 20 хвілін. Максімальная тэмпература — 1200 градусаў. Са ста кілаграмаў спаленых адходаў атрымліваецца 3-5 кілаграмаў бяспечнага попелу. Пасля гэтыя рэшткі вывозяцца на палігон цвёрдых бытавых адходаў.

Прымаюць адходы ў самім цэху. Аўтамабіль і інвентар праходзяць працэдуру дэзынфекцыі. Штомесяц на прадпрыемстве праводзіцца маніторынг паветра.

У цэху могуць спальваць 20 відаў медыцынскіх адходаў. Але ў планах — утылізацыя ўсіх відаў, у тым ліку і вадкіх.

## ХТО ЗАПЛАЦІЦЬ?

Сістэмы збору медыцынскіх адходаў ад насельніцтва ў Беларусі пакуль няма, аднак праца ў гэтым кірунку ўжо вядзецца. Спецыялісты ЦЭР пачалі праект «Непрыдатныя фармацэўтычныя прэпараты ў наваколлі: распрацоўка ўстойлівага падыходу». У выніку эколагі створаць канцэпцыю па зборы медыцынскіх адходаў ад насельніцтва.

Еўрапейскія краіны ўжо маюць вопыт рэалізацыі гэтай задумы. У ЕС існуюць меры маркіроўкі медпрэпаратаў: на этыкетцы абавязкова пазначаецца спосаб утылізацыі прадукту. Для збору медыкаментаў устанаўліваюцца спецыяльныя кантэйнеры. У Рыме такую скрыню ўстанавілі на вуліцы, і ў выніку яе пачалі выкарыстоўваць не па прызначэнні. Іспанцы ставяць кантэйнеры ў аптэках. Аднак у Літве гэтая задумка пацярпела крах, бо ўсе фінансавыя расходы па зборы фармацэўтычных адходаў ад насельніцтва леглі на плечы аптэк. Яны былі ў гэтым не зацікаўлены, таму не інфармавалі сваіх наведвальнікаў пра магчымасць здачы адходаў альбо ўвогуле іх ігнаравалі.

Згодна з вынікамі даследавання, большая частка беларусаў гатова правільна ўтылізаваць медыцынскія адходы, пры гэтым ім будзе зручней выкідваць іх у аптэках. Тым не менш па кантэйнерах ды ўвогуле па сістэме збору ўзнікае шмат пытанняў. Як забяспечыць сартаванне бяспечных фармацэўтычных адходаў ад небяспечных? Як быць з вадкімі медыкаментамі? А галоўнае: хто будзе займацца ўстаноўкай кантэйнераў і аплачваць новую сістэму збору і ўтылізацыі?

На думку спецыялістаў ЦЭР, лепш стварыць спецыялізаваную кампанію, якая будзе займацца зборам адходаў ад насельніцтва (накшталт «Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў»). Абавязваць займацца такой справай аптэкі альбо паліклінікі, зыходзячы з вопыту Літвы, будзе неэфектыўна.

Руслан Хурсік спадзяецца, што дзяржава заахвоціць людзей здаваць адходы, узяўшы частку расходаў на сябе. «Працэдура гэта нятанная: каб спаліць кілаграм цытастатыку (супрацьпухлінныя прэпараты), трэба заплаціць 58 800 рублёў, 30 360 рублёў — кошт кілаграма таблетак», — прывёў лічбы спецыяліст.

У найбліжэйшы час будзе пераглядацца і класіфікацыя адходаў. Па словах **загадчыцы лабараторыі прафілактычнай і экалагічнай таксікалогіі Навукова-практычнага цэнтра гігіены Ірыны ІЛЬЮКОВАЙ**, цытастатыкі не вылучаны ў катэгорыю небяспечных адходаў, хоць такімі з'яўляюцца. Сёння ў медыцынскіх установах захоўваецца каля 50 тон непрыдатных цытастатычных прэпаратаў, спецыялізаваны палігон для такіх адходаў усяго адзін (знаходзіцца ў Чачэрску), і яго магчымасці ўжо абмежаваны.

## ЯК УТЫЛІЗАВАЦЬ ЛЕКІ Ў ХАТНІХ УМОВАХ?

Пакуль сістэма збору медыцынскіх адходаў не наладжана, спецыялісты прапануюць наступныя варыянты. Таблеткі трэба здрабніць і змыць ва ўнітаз. «Вадкасці» проста змываць ва ўнітаз. Мазі неабходна выціснуць у поліэтыленавы пакет, сам цюбік выкінуць асобна.

Пры сартаванні медыцынскіх адходаў абавязкова трэба ўлічваць упакоўку: паперу, шкло, пластык можна здаць на перапрацоўку. Непасрэдна лекі лепш запакаваць і выкінуць у кантэйнер змяшаных адходаў.

Галоўнае, не набывайце «лішніх» лекаў. Калі вы заўважылі, што некаторыя медыкаменты ў вас ляжаць без толку, аддайце іх іншым людзям, якія маюць у іх патрэбу.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# ЧАСНОК АД РАКУ АБАРОНІЦЬ

**Гэта паўднёваазіяцкая расліна сёння шырока культывуецца ў многіх краінах свету. Галоўная карысная якасць часнаку — наяўнасць дыялілсульфіду, складанага арганічнага рэчыва, дзякуючы якому ён валодае спецыфічным пахам, смакам і антыбактэрыйнымі ўласцівасцямі.**

У тыбецкай і кітайскай медыцыне часнок здаўна лічылі прафілактычным сродкам супраць раку. Ён вельмі багаты на селен, да таго ж утрымлівае яшчэ шмат іншых важных кампанентаў, такіх як бялок, вугляводы і розныя мінералы (у тым ліку кальцый, фосфар, жалеза, магній), вітаміны В, С, розныя цукры. Фітанцыды і антыбіётыкі, якія змяшчаюцца ў часнаку, узмацняюць яго прыгнятальнае дзеянне на хваробатворныя мікробы.

Часнок удзельнічае ў рэгуляванні ўзроўню халестэрыну ў крыві, стымулюе крыветварэнне. Прымяненне часнаку 2-3 разы на дзень пасля ежы ў выглядзе кашыцы з адной долькі, разведзенай дзвюма сталовымі лыжкамі вады ці малака, аказвае супрацьалергічнае дзеянне. Часнок вельмі эфектыўны пры адэноме прастаты, пры лячэнні некаторых прадракавых і ракавых захворванняў. Прэпараты часнаку паляпшаюць страваванне, спрыяюць лепшай засваяльнасці ежы, узбуджаюць апетыт, валодаюць супрацьгліставымі ўласцівасцямі. Часнок узмацняе вылучэнне страваваль ных ферментаў і жоўці, падаўляе гніенне і закісанне ў кішэчніку. Адзначаны яго фунгіцыдныя ўласцівасці. Вельмі гаючы і эфектыўны свежы сок з часнаку.

Пры атэрасклерозе будзе карысная часночналімонная настойка. Здробненую на тарцы галоўку часнаку і лімон заліваюць 1 літрам вады і пакідаюць у закаркаваным посудзе на двое сутак, потым п'юць па 1 сталовай лыжцы 3 разы на дзень.

**Свежы часнок вельмі эфектыўны пры ўкусах насякомых (пчол, аваднёў, чмялёў і інш.), яго прыкладваюць да месца ўкусу, а таксама пры бародаўках.**

У выглядзе аэразоляў фітанцыды часнаку прымяняюцца пры бранхіяльнай астме, хранічнай пнеўманіі, пры вострых і хранічных бранхітах, коклюшы, пры захворваннях верхніх дыхальных шляхоў.

Часнок не ўплывае на вірус грыпу, але ён прыгнятае спадарожную мікрафлору, якая абцяжарвае працяг асноўнага працэсу, спрыяе разрэджванню і аддзяленню макроты, аказвае танізавальнае дзеянне на слізістую абалонку дыхальнага тракта.

Вядомы тыбецкі сродак (часночная настойка) ачышчае арганізм ад тоўстых вапнавых адкладанняў, рэзка паляпшае абмен рэчываў, у выніку чаго крывяносныя сасуды становяцца эластычнымі.

**Часночная настойка.** 350 г ачышчанага часнаку дробна нарэзаць і расцерці ў фарфоравым посудзе драўляным таўкачыкам, узважыць 200 г гэтай сумесі, у посуд уліць 200 г 96% спірту. Пасудзіну шчыльна закаркаваць і вытрымаць у халадзільніку 10 дзён, на 11-ы старанна працадзіць праз некалькі слаёў марлі і зноў паставіць у халадзільнік на два дні.

Ужываць: у 50 г халоднага малака на адзін прыём за 15-20 хвілін да ежы наступным парадкам у кроплях перад сняданкам, абедам і вячэрай:

- з 1-га па 5-ы дзень, пачынаючы з 1 кроплі, кожны прыём дабаўляць па 1 кроплі;
- з 6-га па 10-ы дзень, пачынаючы з 15 кропель, кожны прыём памяншаць на 3 кроплі (давесці на 10-ы дзень да 1 кроплі);
- 11-ы дзень і ў далейшым ужываць па 25 кропель за прыём, пакуль не скончацца лекі. Паўтарыць не раней чым праз 6 гадоў.

**Яўген ШМЯРКО, урач-фітатэрапеўт**

**Часнок і яго прэпараты проціпаказаны пры хваробах нырак (нефрыце), печані і эпілепсіі.**

**Дарэчы, нядаўна ў аўтара «Роднай прыроды» — вядомага практыкуючага ўрача-фітатэрапеўта Яўгена Шмярко — у Выдавецкім доме «Звязда» выйшла кніга «Аптэчка прыроды». З дапамогай выдання чытачы пазнаёмяцца з метадамі прафілактыкі і комплекснага лячэння шэрагу захворванняў з дапамогай лекавых раслін. У «Аптэчцы прыроды» можна знайсці і рэцэпты збораў, якія выкарыстоўваюцца аўтарам ва ўрачэбнай практыцы, а таксама падрабязную інфармацыю аб іх складзе, карысці, магчымых негатыўных наступствах і шмат чаго іншага.**

**Чытайце ў вераснёвым нумары часопіса**

**«РОДНАЯ ПРЫРОДА»:**

**— Ці знікнуць пчолы ў Беларусі?**

**— Асцярожна: «зялёны камуфляж» — раскрываем сакрэты грынвошынгу!**

**— Букет кляновых руж, ці Майстар-клас ад восені**

**— Якая расліна «пажар» учыняе?**

**— Кормім хатняга драпежніка, або Чаму для кошкі рыба — не ежа?**

■ Асноўны інстынкт

# ЛОСЬ «УЛЯЦЕЎ» У АЎТОБУС

**На трасе М6 лось літаральна «ўляцеў» у кабіну аўтобуса, які рухаўся на поўным ходзе.**

Паводле інфармацыі ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама, аварыя адбылася каля дзесяці гадзін вечара. Рэйсавы аўтобус Мінск — Гродна вёз пасажыраў у абласны цэнтр, калі на прамым участку дарогі каля вёскі Тарнова Лідскага раёна яму насустрач справа па ходу руху выбег лось. Удару пазбегнуць не атрымалася. Больш за тое, ён быў настолькі моцным, што жывёла «ўляцела» ў кабіну «Неаплана», прабіўшы лабавое шкло.

Кіроўцу аўтобуса вельмі пашчасціла, бо вострыя рогі лася (які загінуў на месцы) нават не зачапілі мужчыну. Другі кіроўца, які знаходзіўся побач, таксама моцна не пацярпеў. У абодвух усяго толькі невялікія ўдары і сінякі. Не пацярпелі і пасажыры, іх у Гродна павёз ужо іншы аўтобус, што прыбыў на месца здарэння. А вось «Неаплану» будзе патрэбен сур'ёзны рамонт.

## Будзь пільным

**Увосень у ласёў пачынаецца шлюбны перыяд. У гэты час самцы агрэсіўныя, вызначаюцца неадэкватнымі паводзінамі і актыўным перасоўваннем па ўгоддзях. Жывёлы часта выходзяць на праезную частку, што ўяўляе сур'ёзную небяспеку (вага асобных самцоў можа дасягаць 450 кілаграмаў). Пры гэтым ласі з-за сваіх біялагічных асаблівасцяў маюць нізкую хуткасць рэакцыі. Каб пазбегнуць небяспекі, ДАІ раіць своечасова зніжаць хуткасць у тых месцах, дзе найбольш верагоднае з'яўленне жывёл.**

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Экасенсацыя

# ПТУШЫНАЯ МОВА МАЕ СЭНС?

**Нядаўна арнітолагі са Швейцарыі, Вялікабрытаніі і Аўстраліі даказалі, што крылатыя здольныя складаць словы з гукаў. Да гэтай пары вучоныя прыпісвалі такое ўменне толькі чалавеку. Спецыялісты вывучалі «размовы» шыладзюбых тымелій — птушак сямейства вераб'іных, якія пражываюць у Аўстраліі. Акустычны аналіз шчабятання паказаў: яны выкарыстоўваюць два акустычныя элементы «А» і «В» і складаюць іх ва ўстойлівыя выразы, надзеленыя сэнсам. Запісаную гутарку давалі паслухаць птушкам, а пасля сачылі за іх рэакцыяй. Падчас праслухоўвання гуку «ВАВ», які азначаў кармленне птушанят, птушкі глядзелі на свае гнёзды. Атрымліваецца, птушыная мова — гэта не бессэнсоўны набор гукаў, а сапраўдны сродак камунікацыі.**

Аднак птушкі разумеюць адна адну не толькі дзякуючы голасу.

— Праз гукавую гаму крылатыя выражаюць эмоцыі. Напрыклад, стандартнай песняй самцы прывабліваюць да сябе самачак і паказваюць іншым, што на гэтай тэрыторыі ўжо ёсць гаспадар, — распавядае **загадчыца лабараторыі арніталогіі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах Ірына САМУСЕНКА**. — Таксама біёлагі адрозніваюць у птушынай мове крыкі трывогі, перасцярогі, адпуўвання драпежнікаў і іншыя. Заўважана, што падчас небяспекі голас у вераб'ёў становіцца больш рэзкім, звонкім.

Існуюць стандартныя фразы-гукаперайманні птушыных галасоў. Песня звычайнай стрынаткі падобная да фразы «вязі, вязі, не трусі». Голас дразда-спевуна можна запомніць па ўстойлівых выразах «філіп-філіп, прыйдзі-прыйдзі, чай піць-чай піць». Перапёлка крычыць «піць-палоць, піць-палоць».

Крылатыя аднаго віду добра разумеюць крыкі сваіх родзічаў. Акрамя таго, птушкі адрозніваюць галасы сваіх ворагаў, што дапамагае ім своечасова папярэдзіць сваякоў пра небяспеку. «Сігналы» выкарыстоўваюцца для інфармавання пра ежу, абазначэння тэрыторыі, пры сварках.

Праўда, не ўсе птушкі маюць добра развіты галасавы апарат. Вы ніколі не пачуеце песню даслага белага бусла. Птушка-маўчун закідвае галаву і трашчыць дзюбай — такім дзеяннем яна замяняе галасавую камунікацыю. Птушаняты буслоў «шыпяць». Нават пастава або простая перадача галінкі ці здабычы ад птушкі да птушкі ўжо лічыцца «мовай». Круцігалоўка, дзякуючы доўгай шыі і шыпенню, добра імітуе змяю і адпуўвае ад сябе ворагаў. Танцы журавоў на зямлі ці некаторых драпежных птушак у паветры таксама лічацца камунікатыўным сродкам.

У скандынаўскай міфалогіі здольнасць разумець птушыную мову лічылася знакам вялікай мудрасці. Здаецца, дзякуючы адкрыццям арнітолагаў, фразеалагізм «птушыная мова» неўзабаве страціць сваё значэнне і набудзе іншы сэнс.

**Кацярына РАДЗЮК.** *radziuk@zviazda.by*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ПРЫЦЯГНЕННЕ ШАЎКОВАГА ШЛЯХУ

## Як увасабляецца ў жыццё самы буйны транснацыянальны праект сучаснасці

Два гады таму — у верасні 2013-га — старшыня КНР Сі Цзіньпін прапанаваў маштабны праект «Адзін пояс — адзін шлях». У яго межах мяркуецца стварыць транспартны, энергетычны і гандлёвы калідор паміж краінамі Цэнтральнай, Паўднёвай Азіі і Еўропы. Па сутнасці, увасабляюцца два інфраструктурныя праекты: «Марскі шаўковы шлях XXI стагоддзя» і «Эканамічны пояс Вялікага шаўковага шляху». Першы ўяўляе сабой сетку маршрутаў, што злучаюць кітайскія порты з портамі Сінгапура, Малайзіі, Інданезіі, Аўстраліі. «Эканамічны пояс» зарыентаваны на будаўніцтва высакахуткасных транспартных сетак на тэрыторыі Еўразіі. Праект стымулюе інфраструктурнае развіццё Паўночнага, Цэнтральнага і Паўднёвага эканамічных калідораў паміж Азіяй і Еўропай. Аснову гэтага пояса складуць чыгуначныя і аўтамабільныя магістралі. Ён праходзіць па лініі ад Пекіна па тэрыторыі Заходняга Кітая, Казахстана і далей па тэрыторыі Расіі да Балтыйскага мора з адгалінаваннем на Беларусь, Польшчу і Германію. Аб перспектывах рэалізацыі найбуйнейшага праекта сучаснасці разважалі ўдзельнікі Еўразійскага медыясемінара і форуму супрацоўніцтва СМІ «Адзін пояс, адзін шлях» (на ім, дарэчы, было каля 170 прадстаўнікоў СМІ з 60 краін свету), якія былі арганізаваны газетай «Жэнмінь жыбаа».

### КАРАВАН ГІСТОРЫІ

У Ланьчжоускім універсітэце (дарэчы, адной з самых буйных вышэйшых навучальных устаноў Кітая) створаны навуковы цэнтр, які займаецца вывучэннем культуры і эканомікі Вялікага шаўковага шляху. Тут можна з лёгкасцю перакінуць мост са старажытнасці ў сучаснасць. Так бы мовіць, адчуць грандыёзнасць ідэі, яе тысячагадовыя карані.

Як адзначаюць спецыялісты, Вялікі шаўковы шлях адыграў вялікую ролю ў развіцці эканамічных і культурных сувязяў народаў Пярэдняй Азіі, Каўказа, Сярэдняй Азіі і Кітая. Ён, напрыклад, служыў спосабам распаўсюджвання, кажучы па-сучаснаму, інавацый, у тым ліку ў тэхналогіі (сама вытворчасць шоўку, а таксама пораху, паперы), мастацтве (танцы, музыка, выяўленчае мастацтва, архітэктура), рэлігіі (хрысціянства, будызм, іслам, маніхейства). Пры гэтым амаль усе ноу-хау (за выключэннем, мабыць, калясніцы ў найстаражытнейшыя часы) распаўсюджваліся з Кітая на захад, а не ў процілеглым кірунку.

Спачатку шаўковы шлях браў свой пачатак у Чаньані — старажытнай сталіцы Кітая — і ішоў уздоўж паўночнага Цянь-Шаня да Дуньхуа — горада на ўскрайку Вялікай Кітайскай сцяны. Тут дарога разгаліноўвалася, абыходзячы з поўначы і поўдня пустыню Такла-Макан.

**Найбуйнейшы ў гісторыі эканамічны праект «Шаўковы шлях» аб'яднае каля 4,5 мільярда чалавек і звыш 60 краін свету. Велізарны эканамічны калідор злучае цэлыя кантыненты. Даўжыня адроджанага даўнейшага шляху перавысіць 12 тысяч кіламетраў. Эканамічная зона расцягнецца амаль на трэць зямной паверхні.**

Паўночная ішла праз Турфан у даліну ракі Ілі. Сярэдняя (так званы Паўднёвы шлях) ад Чаочана да паўднёвага берага Ісык-Куля — праз Хаан і Яркенд, вяла ў Бактрыю (паўночны Афганістан). Тут Паўднёвы шлях разыходзіўся на два іншыя маршруты: адзін вёў у Індыю, другі — на Захад і ў Мерв, дзе зліваўся з Паўночным шляхам. Далей ён праходзіў праз Нясу — сталіцу Парфіі, Іран, Месапатамію і далей праз Багдад ішоў у Дамаск, даходзіў да Міжземнамор'я.

Заснаванне Шаўковага шляху адносяць да II стагоддзя да н.э., калі кітайскі пасол Чжан Цянь наведаў краіны Цэнтральнай Азіі з дыпламатычнай місіяй. Дагэтуль шлях з Еўропы ў Азію абрываўся каля межаў Кітая, бо горныя сістэмы Азіі — Цянь-Шань, Кунь-Лун, Каракарум, Гіндукуш, Гімалаі — адгароджвалі старажытную кітайскую цывілізацыю ад астатняга свету. Так сустрэліся даўнейшыя цывілізацыі Сярэдняй Азіі і Кітая, а пазней міжземнаморскіх краін і Індыі. Сышліся ў адзінае цэлае дзве вялікія дарогі. Адна, якая ішла з Захаду, з краін Міжземнамор'я ў Сярэднюю Азію, разведаная і пройдзеная грэкамі падчас паходаў Аляксандра Македонскага. Другая вяла з Усходу, з Ханьскай імперыі ў Цэнтральную Азію, была адкрыта Чжан Цянем, які прайшоў гэту вобласць з поўначы на поўдзень праз Давань, Кангюй, Согд, Бактрыю.




Тавары па Вялікім шаўковым шляху ішлі галоўным чынам з усходу на захад. І, як вынікае з назвы, галоўным таварам у гэтым спісе быў шоўк. Дзякуючы сваёй лёгкасці, кампактнасці, значнаму попыту і кошту ён з'яўляўся ідэальным прадметам гандлю для перавозкі на далёкія адлегласці. Яшчэ ў Сярэднявеччы венецыянскі купец Марка Пола назваў гэтыя караванныя шляхі шаўковымі. А ў навуковы зварот тэрмін «Вялікі шаўковы шлях» у 1877 годзе ўвёў нямецкі даследчык Фердынанд Рыхтгофен у сваёй фундаментальнай працы «Кітай».

Дарэчы, шоўк быў хоць і галоўным, але далёка не адзіным таварам, які перавозіўся па транскантынентальным шляху. З Цэнтральнай Азіі вывозіліся коні, якія вельмі цэняцца ў Кітаі, вайсковы рыштунак, золата і серабро, паўкаштоўныя камяні і вырабы са шкла, скура і поўсць, дываны і баваўняныя тканіны, экзатычная садавіна — кавуны і персікі, а таксама курдзючныя авечкі і паляўнічыя сабакі, леапарды і львы. З Кітая караваны везлі фарфор і металічны посуд, лакіраваныя вырабы і касметыку, чай і рыс. У дарожных мяшках купцоў можна было знайсці слановыя біўні, насарогавыя рогі, чарапахавыя панцыры, вострыя спецыі і шмат чаго іншага. Дарэчы, многія дзівосы, дзякуючы археолагам, і дасюль можна на ўласныя вочы пабачыць сярод экспанатаў музея правінцыі Ганьсу, які размешчаны на маляўнічым узбярэжжы вялікай кітайскай ракі Хаунхэ.

### ІНВЕСТЫЦЫІ НА $900 МЛРД

Сама ідэя адзінай хуткаснай аўтамабільнай магістралі, якая звяжа краіны Еўропы з Кітаем, нарадзілася яшчэ ў сярэдзіне 2000-х. Звязана гэта было з імклівым павелічэннем аб'ёмаў гандлю паміж ЕС і КНР, абарот якога летась дасягнуў €467 млрд. Па звестках Еўрапейскай канферэнцыі міністраў транспарту, за 20 гадоў гандаль паміж еўрапейскімі і азіяцкімі краінамі вырас у шэсць разоў.

Сёння львіная доля грузаперавозак паміж Кітаем і Еўропай ажыццяўляецца па марскім шляху праз Суэцкі канал. Працягласць такога маршруту складае прыкладна 24 тысячы кіламетраў, пры гэтым дастаўка грузу займае ад 40 да 50 сутак. Наземны шлях будзе забяспечваць высокі ўзровень бяспекі і дазволіць значна скараціць час у дарозе. Між тым, ужо сёння асноўную частку грузапатокаў паміж КНР і краінамі ЕС складаюць тавары з высокай дабаўленай вартасцю, якія аб'ектыўна больш падыходзяць для перавозак аўтамабільным і чыгуначным транспартам.

Адпаведна, падаецца лагічнай ініцыятыва па адраджэнні эканамічнага пояса Вялікага шаўковага шляху, які павінен уключыць не толькі транспартныя сеткі, але і аб'екты энергетычнай і прамысловай інфраструктуры. Кітайскія ўлады ўжо гатовы ўкласці ў яго развіццё больш за $40 млрд, для гэтага створаны спецыяльны Фонд развіцця Шаўковага шляху (Silk Road Fund Co Ltd), інвестарамі якога выступаюць Экспартна-імпартны банк Кітая, Банк развіцця Кітая і Суверэнны фонд дабрабыту Кітая. Як адзначаюць эксперты, з улікам прыватных інвестыцый у праект «Адзін пояс, адзін шлях» будзе ўкладзена да 900 мільярдаў долараў.

Найбуйнейшы ў гісторыі эканамічны праект «Шаўковы шлях» аб'яднае каля 4,5 мільярда чалавек і звыш 60 краін свету. Велізарны эканамічны калідор злучае цэлыя кантыненты. Даўжыня адроджанага даўнейшага шляху перавысіць 12 тысяч кіламетраў. Эканамічная зона расцягнецца амаль на трэць зямной паверхні. Па сваіх маштабах кітайскі праект перакрывае ініцыяваныя ЗША Трансціхаакіянскую і Трансатлантычную зоны вольнага гандлю. Гаворка ідзе пра фарміраванне адзінага еўразійскага рынку, а шматбаковае пагадненне пра вольны гандаль павінна стаць завяршальнай рысай. Гаворка фактычна ідзе пра фарміраванне адзінага еўразійскага рынку — свайго роду аналага Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

«Марскі шаўковы шлях XXI стагоддзя» пачнецца ў кітайскіх портах Гуанчжоу і Кантон, пройдзе праз Тайланд, В'етнам, Малайзію, Сінгапур і Інданезію, Індыйскі акіян, Чырвонае мора, Персідскі заліў, Суэцкі канал і Міжземнае мора. Магчыма, будзе створана і адгалінаванне ў бок Афрыкі, у Кенію. Марскі і сухапутны шляхі сімвалічна сыдуцца ў Венецыі.

### УНІКАЛЬНЫ ШАНЦ

Такім чынам, грандыёзны план складаецца з будаўніцтва хуткасных чыгуначных магістраляў, аўтамабільных дарог і трас, сетак перадачы энергетычных рэсурсаў, оптавалаконных сетак. Гарады і порты, праз якія будзе праходзіць гэты шлях, бясспрэчна чакае бурны эканамічны рост.

Многія краіны дакладна ўсведамляюць усю сур'ёзнасць намераў Кітая. Аб гэтым, дарэчы, яскрава сведчыць сітуацыя з Азіяцкім інфраструктурным інвестыцыйным банкам. 58 краін пагадзіліся стаць яго заснавальнікамі, прычым не толькі тыя, праз якія пройдзе новы Вялікі шаўковы шлях, але і большасць дзяржаў Заходняй Еўропы. Сярод заснавальнікаў банка 12 краін НАТА (Вялікабрытанія, Францыя, Нідэрланды, Германія, Італія, Люксембург, Данія, Ісландыя, Іспанія, Партугалія, Польшча і Нарвегія), а таксама тры асноўныя саюзнікі ЗША ў акваторыі Ціхага акіяна — Аўстралія, Паўднёвая Карэя і Новая Зеландыя. Кітай таксама плануе ўнесці сама меней $62 млрд у тры банкі, якія будуць аказваць падтрымку новаму Шаўковаму шляху. Кітайскі банк развіцця атрымае $32 млрд, Экспартна-імпартны банк Кітая атрымае $30 млрд. Апроч таго, кітайскі ўрад укладзе дадатковы капітал у Банк развіцця сельскай гаспадаркі Кітая.

**Ад рэалізацыі глабальнага праекта карысць адчувальная. У тым ліку і для нашай краіны. Беларусь фактычна злучае Еўразійскі эканамічны саюз і Еўрапейскі саюз. Нездарма ж падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і старшыні КНР Сі Цзіньпіна наша дзяржава была названа «важнай вузлавой платформай Шаўковага шляху».**

На думку экспертаў, капітал рушыць туды, дзе ёсць развіццё. У свеце, дзе эканамічны рост амаль застыў, а Еўропа змагаецца з наступствамі сусветнага крызісу, дзе яшчэ можа быць рэалізаваны праект, які прапануе так шмат магчымасцяў? Як заўважыў прэзідэнт іспанскага інфармацыйнага агенцтва EFE Хасэ Антоніа Вера, рэалізацыя канцэпцыі эканамічнага пояса Шаўковага шляху мае важнае практычнае значэнне не толькі для самога Кітая, а і для ўсіх рэгіёнаў свету.

Перспектыва ў новага Вялікага шаўковага шляху відавочная. Таму шэраг вытворцаў у нецярплівым чаканні. Многія горназдабыўныя кампаніі, такія як Vale, якія ў апошні час перажывалі заняпад на сусветным рынку, цяпер з радасцю падлічваюць, колькі сталі запатрабуецца на будаванне новай хуткаснай чыгункі. Калі праект будзе рэалізаваны, гэта прывядзе да новага буму ў горназдабыўнай прамысловасці па ўсім свеце, а таксама да новага росквіту ў будаўнічай прамысловасці. Але развіццё чакае не толькі гэтыя галіны. Мяркуецца актыўны абмен і развіццё тэхналогій, культурнае ўзаемадзеянне. Тут не менш важны і фактар сацыяльны — можна толькі ўявіць, колькі ў выніку рэалізацыі праекта будзе створана новых працоўных месцаў.

Так што ад рэалізацыі глабальнага праекта карысць адчувальная. У тым ліку і для нашай краіны. Беларусь фактычна злучае Еўразійскі эканамічны саюз і Еўрапейскі саюз. Нездарма ж падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і старшыні КНР Сі Цзіньпіна наша дзяржава была названа «важнай вузлавой платформай Шаўковага шляху». Ужо цяпер рэалізуюцца шэраг сумесных праектаў. Адзін з асноўных — кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». КНР імкнецца стварыць з замежнымі партнёрамі новыя сучасныя тэхнапаркі і прамысловыя кластары. На думку намесніка міністра камерцыі Кітая Цянь Кэміна, адзін з самых паспяховых у гэтым плане праектаў — стварэнне кітайска-беларускага індустрыяльнага парка. Можна быць упэўненымі, што мы свой шанц дакладна не ўпусцім.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.** *litvinov@zviazda.by*

# ТУТ ЖЫВЕ ДУХ МІХАЛА КЛЕАФАСА АГІНСКАГА

## У Залессі адкрылася адноўленая сядзіба кампазітара

**Многія нашы слаўныя суайчыннікі знайшлі сабе надзейную «прапіску» ў культурах іншых народаў. І мы не можам скардзіцца на суседзяў за тое, што быццам прысвоілі сабе наша. Яны папросту своечасова сабралі ўсе гістарычныя звесткі, што яднаюць дзеячаў з іх зямлёй, адразу ўвекавечылі іх — у памятных дошках, кнігах, назвах вуліц, гэтым паспрыяўшы замацаванню ў свядомасці сваіх народаў. А мы, шчыра кажучы, проста паленаваліся тое зрабіць, добраахвотна аддаўшы сваю спадчыну іншым.**

**Аднак ёсць герой, якога сапраўды можна лічыць беларускім нацыянальным. Гэта Міхал Клеафас Агінскі. Суседнія народы шануюць яго, але не прэтэндуюць на поўнае валоданне памяццю. Літоўцы і рады б запісаць у шэрагі сваіх дзеячаў Агінскага, ды ў іх краіне жылі толькі яго дзеці і ўнукі. Палякі часам абвінавачваюць Агінскага ў здрадзе за тое, што ён вымушаны быў ісці на паклон да расійскага імператара. Рускія, натуральна, не прэтэндуюць на гэтага дзеяча, які ў межах Расійскай імперыі імкнуўся адрадзіць Вялікае Княства Літоўскае, нават склаў яго канстытуцыю. Украінцы прызнаюць і шануюць талент кампазітара, аднак з іх зямлёй яго біяграфія пераплецена не надта шчыльна. Затое ў Беларусі ён пражыў самыя шчаслівыя 20 гадоў, менавіта ёй прысвечаны славуты паланэз «Развітанне з Радзімай».**

Рамантычнае навакольле сядзібы надзвычай натхняла кампазітара.

Агінскі марыў пра аднаўленне вольнай Бацькаўшчыны. З дзяцінства ён рыхтаваўся да дыпламатычнай кар'еры, ужо ў маладым узросце займаў палітычныя пасады. Але праславіўся ён найперш як кампазітар. Калі Агінскі прыйшоў на прыём да імператрыцы Кацярыны, каб дамагчыся вырашэння сваіх палітычных інтарэсаў, яна заўважыла, што ўсе дваране растуць на невялічкіх узгорках. Сцежкі то пераплятаюцца адна з адной, то хаваюцца, то зноў выслізгваюць дзесьці напарадзе. Сентыментальныя белыя лавачкі быццам запрашаюць цябе прысесці і паразважаць пра нешта высокае. Да сядзібы вядзе прасторная дарога, абсаджаная высачэзнымі дрэвамі. Аднак гэта толькі частка таго, што было пры творцы. Пасля аднаўлення сядзібы пачалі весці размовы, што наступны крок — аднаўленне парку.

Даследчыца жыцця і творчасці Агінскага Святлана НЕМАГАЙ сваё выступленне на навукова-практычнай канферэнцыі суправаджала музычнымі «ілюстрацыямі».

танцуюць пад яго паланэз. Ва ўсіх музычных салонах Еўропы таксама нязменна гучала музыка гэтага кампазітара.

Планы Агінскага па аднаўленні краіны ў межах Расійскай імперыі не спраўдзіліся. Не ажыццявіліся і яго спадзяванні на Напалеона, які таксама не праявіў цікавасці да аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага. Усё тое, чым жыў наш суайчыннік, абрынулася. Нічога не заставалася яму, як толькі ў родавым маёнтку ў Залессі стварыць сваю маленькую ідэальную краіну. І гэта яму ўдалося.

Калі трапляеш у Залессе, адразу адчуваеш яго асаблівы рамантызм. Нават сам парк вакол сядзібы быццам захоўвае дух кампазітара. Дрэвы

На ўрачыстым адкрыцці сядзібы, якое адбылося ў дзень народзінаў кампазітара — 25 верасня, прысутнічала шмат шаноўных гасцей: прадстаўнікі дыпламатычных місій, нашчадкі творцы, прадстаўнікі літоўскіх гарадоў-пабрацімаў Смаргоні, міністр культуры Барыс Святлоў, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў і многія іншыя. Якой жа ўбачылі яны адноўленую сядзібу?..

Рэстаўрацыя закранула не толькі знешні выгляд колішняга ўладання кампазітара. Адноўлена і ўнутранае аздабленне інтэр'ераў, якое цяпер не саступае Міру і Нясвіжу. У гэтым упэўнена аўтар экспазіцыі — **дырэктар Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Зінаіда КУЧАР.** Менавіта яе руплівымі рукамі аднаўляліся шыкоўныя пакоі.

Прызнацца, тое, што створана ўнутры палаца, сапраўды ўразіла. Веліч і прыгажосць. Гэта павінен убачыць кожны. Некалькі вестыбюляў, вялікая і малая гасцёўні, кабінет кампазітара, тэатральна-музычная зала. Усталяваны тут нават більярдны стол — ён быў традыцыйным атрыбутам сядзіб таго часу. Маецца нават уласная аранжарэя: кампазітар вельмі любіў экзатычныя расліны, піў гарбату са сваімі гасцямі пасярод такога незвычайнага саду. У адной з галерэй зроблена элегантная кавярня — пасярод высокіх белых калон размешчаны плеценыя столікі са шкляной паверхняй, побач — такія ж крэслы. Наведвальнікі могуць зайсці сюды не толькі на кубачак кавы, але і каб падсілкавацца.

Зінаіда Кучар адзначае, што ўся мэбля, размешчаная тут, тыповая для XIX стагоддзя. Яе замаўлялі па каталогах антыкварных крам.

Таму, завітаўшы ў Залессе, трэба абавязкова не толькі паблукаць па ўзнёслых ваколіцах сядзібы, але і прагуляцца па аранжарэі з экзатычнымі раслінамі, наведаць напоўненую святлом бялюткую кавярню. Дарэчы, падчас адкрыцця нас, акрамя іншых прысмакаў, частавалі выдатнай беларускай стравай — цэпелінамі. Таму будзьце ўпэўнены, што гатуюць у гэтай кавярні вельмі смачна.

Сядзіба толькі адкрылася, а на выхадных тут ужо няспынна, адна за адной, ішлі экскурсіі. **Дырэктар сядзібы Міхала Клеафаса Агінскага ў Залессі Людміла ГРАДЗІЦКАЯ** адзначыла:

— У мінулым годзе, калі ў нас працавала толькі адна зала, прынялі 4000 турыстаў. А сёлета да нас ужо завітала 13 000 наведвальнікаў. Верагодна, што пасля адкрыцця адноўленых інтэр'ераў іх будзе ў два разы больш. Людзі ўжо цікавяцца, тэлефануюць. У суботу і нядзелю мы праводзілі экскурсіі праз кожныя 15 хвілін... Тут жыве дух Міхала Клеафаса Агінскага, ён лунае над намі. Тут прысутнічае пэўны рамантызм і людзі сябе вельмі добра адчуваюць. У кнізе водгукаў нашы наведвальнікі часта пакідаюць нават... свае вершы. Мы, мясцовыя, даўно марылі, каб сядзіба адкрылася. І цяпер для нас гэта вялікі гонар.

Нельга не згадаць і пра адну цікавую традыцыю, якая з'явілася падчас адкрыцця сядзібы — дарыць ёй аўтэнтычныя рэчы. Так **старшыня Смаргонскай раённай арганізацыі прафсаюзаў Ганна ДЖУМКОВА** падарыла аўтэнтычную скрыню XIX стагоддзя для лістоў. Цяпер у ёй будзе захоўвацца ліставанне кампазітара. Для таго, каб набыць такі каштоўны падарунак, усе ўдзельнікі арганізацыі рабілі добраахвотныя ўнёскі. Сапраўды добры прыклад для пераймання.

Свята 250-годдзя Агінскага ў Залессі гуло і спявала. Тут прайшлі спектакль Мінскага абласнога драматычнага тэатра «Паланэзы на вяртанне», выступленне залескага тэатра «Батлейка». Правялі пленэр па стварэнні сучасных пейзажаў ваколіцы. Гледачы ўбачылі тэатралізаваны паказ конна-спартыўнага клуба «Залатая шпора».

У суботу ў Залессі прайшоў сапраўдны баль. Яго — згодна з усімі традыцыямі і канонамі арыстакратычнага мерапрыемства — правялі вопытныя рэканструктары. Танцавала ў сядзібе кампазітара ў гэты дзень каля 60 гасцей.

Мясцовы настаўнік гісторыі распавёў карэспандэнту «Звязды», што за часам незалежнасці ў Беларусі дзень народзінаў Агінскага ў Залессі заўсёды адзначаўся надзвычай весела. Гэта сапраўднае свята для ўсіх месцічаў. Яшчэ з пачатку 1990-х гадоў залесцы збіраліся тут і ладзілі свае імправізаваныя пастаноўкі. Пасля частаваліся мясцовым напоем, так званай «амброзіяй», і цешылі сябе думкай, што ўжываюць напітак, які даваў маладосць і бяссмерце жыхарам Старажытнай Грэцыі. Заядалі ўсё вялізным пірагом, складзеным з канапэ з хлеба і сала. Да свята заўсёды далучалася 30-40 студэнтаў з Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта спецыяльнасці «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва». Дзякуючы такому вясёламу кагалу народзіны кампазітара гулі амаль на ўсю Беларусь.

Імператрыца Кацярына і Міхал Клеафас. Са спектакля «Паланэзы на вяртанне».

Сам Агінскі вельмі любіў прымаць гасцей і добра рабіў гэта. Захавалася архіўная кніга з запісамі яго сяброў, у якой шмат допісаў уплывовых і вядомых людзей таго часу. Нездарма сядзібу называлі «Паўночнымі Афінамі» — усе тагачасныя «багі» збіраліся ў кампазітара...

Нельга не прыгадаць і бяссмертны паланэз «Развітанне з Радзімай», напісаны менавіта тут. Агорнуты меланхоліяй і сумам з прычыны неабходнасці пакінуць мілы сэрцу край, кампазітар стварыў свой шэдэўр.

Музычная спадчына кампазітара нарэшце запісваецца і выпускаецца на пэўных носьбітах. Так, фонд «Паўночныя Афіны Міхала Клеафаса Агінскага», пры падтрымцы кампаніі «Еўразія», спецыяльна да юбілею выдаў дыск з усімі 27 паланэзамі кампазітара. Сустаршыня фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» Уладзімір Сівуха распавёў, што ў іх запісаны дыск з 19 рознымі выкананнямі паланэза «Развітанне з Радзімай». Аднак абодва дыскі створаны не для продажу, абмежаваным тыражом: іх можна атрымаць толькі ў падарунак.

Уладзімір Сівуха жартам адзначае, што, перасякаючы мяжу, яны заўсёды ўключаюць «Развітанне з Радзімай» — і ні адзін памежнік не мае ніякіх прэтэнзій. Іх кіроўца ўжо так прывык да класічнай музыкі нашага вялікага кампазітара, што катэгарычна супраць слухаць нешта іншае.

Варта прыгадаць, што «Паланэз Агінскага» калісьці разглядалі ў якасці магчымага афіцыйнага гімна нашай краіны. Ён і сапраўды заварожвае, абуджае гонар, адкрывае ў душы схаваную памяць пра тое велічнае і неверагоднае, што ёсць у нашай гісторыі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*Залескі раён.*

■ Запрашальнік

# У пакоі старасвецкія зазірнуўшы

**Некалі сядзібныя дамы былі яскравым упрыгажэннем беларускай зямлі. Яны з'яўляліся сапраўднымі асяродкамі культуры — сядзібная спадчына стала асновай для развіцця многіх відаў беларускага мастацтва: музыкі, жывапісу, літаратуры. Менавіта ў такіх дамах нарадзіліся і выхоўваліся Міхал Клеафас Агінскі, Напалеон Орда, Фердынанд Рушчыц і іншыя. Больш яскрава ўявіць, як выглядалі сядзібы даўніх часоў, адчуць іх атмасферу цяпер можна на выставе «У пакоі старасвецкія зазірнуўшы», якая 1 кастрычніка адкрыецца ў Дзяржынскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі.**

Усе прадстаўленыя на выставе экспанаты — са збораў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Там захоўваецца ўнікальная калекцыя мэблі, якая бытавала ў мяшчанскіх дамах і сядзібных уладаннях шляхты XIX — пачатку XX стагоддзя, а таксама калекцыі прадметаў інтэр'еру, побыту таго часу. Можна ўбачыць, напрыклад, месцы для прыёму гасцей, пакоі для асабістага баўлення часу.

Пляцоўкай для экспанавання выставы невыпадкова былі выбраны залы дзяржынскага музея. Справа ў тым, што менавіта сядзіба ў Койданаве (да 1932 года горад Дзяржынск называўся Койданава) у старажытнасці паклала пачатак фарміраванню горада. Акрамя таго, вакол Койданава размяшчалася вялікая колькасць сядзібных дамоў: у Станькаве, Прылуках, Негарэлым, Коласаве — сядзібы Чапскіх; у Малых Навасёлках — сядзіба Кастравіцкіх; у Гаруцішках — сядзіба Пашкевічаў; у Волме — сядзібы Ваньковічаў, Капылінскіх.

Сядзіба ў яе выпрацаванай стагоддзямі форме сёння ўжо не функцыянуе. Але яшчэ доўга яна будзе важным элементам нацыянальнага самапазнання. Унутранае ўбранне сядзібных дамоў увачавідкі паўстае перад намі праз апісанні, мемуары, інвентары, карціны і малюнкі. І яшчэ болей адкрываецца праз экспанаты выставы, якая будзе працаваць у дзяржынскім музеі да 13 снежня.

**Варвара ГОМАН**

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# «Неаготыка бярэ не золатам, а архітэктурнай прыгажосцю»

## ЧЫМ СЁННЯ ЖЫВЕ АДЗІНАЯ Ў КРАІНЕ ЛЮТЭРАНСКАЯ КІРХА

**Лютэранства — адна з традыцыйных для нашай краіны канфесій. У Гродне, напрыклад, яно з'явілася яшчэ пры каралі Станіславе Аўгусце Панятоўскім, які ў 1793 годзе запрасіў сюды майстроў з Германіі. Разам з імі на землі Заходняй Беларусі трапілі ідэі лютэранства — рэфармаванай царквы. А пачалося ўсё з Марціна Лютэра, які прыбіў да дзвярэй касцёла свае знакамітыя 95 тэзісаў, у якіх, сярод іншага, выступаў за адмену індульгенцый, за тое, каб набажэнствы вяліся на зразумелай прыхаджанам мове. Ідэі былі падхоплены, бо адпавядалі настроям часу, і Рэфармацыя закрочыла па свеце. У Беларусь яна прыйшла найперш з кальвінізмам, які распаўсюджваў Мікалай Радзівіл Чорны. Менавіта на час Рэфармацыі ў нашай гісторыі прыпадае «залаты век» Беларусі. Даўнія часы прамінулі, многае змянілася. Што сёння засталося ад таго лютэранства?..**

Фота Ніны ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Сустракаюцца ў Беларусі лютэране і сёння, праўда, іх няшмат. Раней у кожным абласным горадзе працаваў адзін ці некалькі лютэранскіх храмаў — кірхаў. На сёння іх засталося толькі тры, аднак нават яны не выкарыстоўваюцца па сваім непасрэдным прызначэнні. У брэсцкай кірсе раней размяшчаўся кінатэатр «Змена», цяпер памяшканні здаюцца ў арэнду. У Полацку ў будынку храма знаходзіцца краязнаўчы музей. І толькі адна кірха — у Гродне — выкарыстоўваецца па сваім непасрэдным прызначэнні. Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з яе **пастарам Уладзімірам ТАТАРНІКАВЫМ,** каб распытаць, чым жыве адзіны ў сваім родзе храм.

Адметна, што гэты пастар вельмі малады — яму ўсяго 29 гадоў, і гэта пры тым, што свой сан ён атрымаў 6 гадоў таму. Яго добра ведаюць гарадзенцы, нават не прыхаджане. Да пастара можна папросту зайсці на гарбату, пагутарыць пра жыццё і шчыра пасмяяцца. Ён адкрыты для кожнага, як і яго кірха.

### «Мэблю, люстры, арган... забралі для партыйных кабінетаў»

Пастар расказаў, што храм з'явіўся ў 1793 годзе, аднак з таго часу неаднаразова перабудоўваўся, бо прыход рос. Лютэранская супольнасць у Гродне ў той час складалася з немцаў, якія валодалі тут фабрыкамі, заводамі, — гэта былі забяспечаныя людзі, якія шмат дапамагалі ў будаўніцтве і аздабленні храма.

Тая кірха, якую мы бачым сёння, была пабудаваная ў 1912 годзе, у стылі неаготыкі. Храму належаў таксама дом пастара — цяпер у ім знаходзяцца жылыя кватэры. Меліся і храмавыя могілкі, аднак пасля вайны на іх месцы пабудавалі дзіцячы садок.

З моманту пабудовы храма ў пачатку XX стагоддзя ён моцна пацярпеў — спачатку праз Першую сусветную, пасля Вялікую Айчынную войны. У 1941 годзе Сталін выдаў указ аб дэпартацыі ўсіх людзей нямецкага паходжання — іх вывозілі ў Сібір. А храм было загадана забраць на карысць абласнога архіва, які неўзабаве сюды завезлі.

Такім чынам, з 1944 па 1993 год у гарадзенскай кірсе знаходзіўся архіў. Мэблю, люстры, арган, што меліся тут, загадалі забраць для залы пасяджэнняў гарсавета, партыйных кабінетаў і філармоніі. Усё, што знаходзілася ў храме, было забрана. Да сённяшняга дня невядома, дзе ўсё гэта знаходзіцца. Старажылы кажуць, што арган быў разабраны і разбураны, бо ў той час уся ўвага была сканцэнтравана на аднаўленні краіны пасля вайны, а справа захавання культурных каштоўнасцей мала каго хвалявала. Магчыма, арган быў проста знішчаны надвор'ем.

Ні люстры, ні мэблю, ні агароджу, якая стаяла вакол кірхі да 1970 года, адшукаць не ўдалося. Нават не захавалася архіўных дакументаў, якія б сведчылі пра ўнутранае аздабленне. Магчыма, каштоўныя прадметы былі вывезеныя нямецкімі салдатамі падчас вайны ці знаходзяцца ў нейкіх іншых архівах, прыватных калекцыях. Некаторыя старыя рэчы прыносяць людзі, аддаюць кірсе.

З аўтэнтычнага аздаблення храма, якое ўсё-такі захавалася, — гадзіннікавы механізм 1913 года, звон 1912 года (падарунак ад праваслаўнай царквы лютэранскай грамадзе), купель, дзе адбываецца хрышчэнне, і алтарныя бакавыя вітражы.

### «Шпіль аднавілі па старых фотаздымках»

Сучасная гродзенская лютэранская абшчына аднавілася ў 1993 годзе. У 1995-м ім у карыстанне быў перададзены будынак кірхі. За гэтыя 20 гадоў абшчына змагла правесці невялікі рамонт унутры храма. Знайсці фінансаванне для рэстаўрацыі фасада было вельмі складана. Аднак зрабіць гэта давялося, бо грунтавыя воды падтачвалі сцены храма, да таго ж побач пабудавалі фабрыку, з прычыны чаго ў сценах царквы з'явіліся трэшчыны. Аднак гэтым летам, дзякуючы падтрымцы ўлад, прыватнага бізнесу, у кірсе была завершана рэстаўрацыя.

З часоў аднаўлення храма ў 1912 годзе да сённяшніх дзён ён дайшоў істотна зменены. Быў страчаны самы галоўны элемент — шпіль. Ёсць тры версіі таго, як гэта адбылося. Першая — у ім падчас вайны сядзеў снайпер або кулямётчык, і таму шпіль збілі. Другая — ён быў вышэйшы за праваслаўны Пакроўскі сабор, таму яго «падкарацілі». Трэцяя — за часам атэізму храм павінны былі знесці, таму зрэзалі шпіль. Яго аднавілі па старых фотаздымках, якіх захавалася дастаткова. Усяго ж на кірсе 10 шпіляў. Усе яны набылі завершаны выгляд, для кожнай адлілі свой крыж.

Пастар адзначае, што раней у кірсе было шмат ляпніны. Неаготыка бярэ не золатам, а архітэктурнай прыгажосцю — усё даволі строга, але прыгожа. Перад рэстаўратарамі стаяла задача перадаць гэта. Правялі хіміка-фізічнае даследаванне, якое дапамагло ўстанавіць першапачатковы колер храма. Аказалася, што кірха была бела-шэрай. Яе патынкавалі, і яна набыла менавіта такі колер. Былі вырашаны і першачарговыя задачы — прыбралі грунтавыя воды, якія падточвалі падмуркі, ліквідавалі ўсе трэшчыны.

### «Гучыць арган, іграюць класіку»

Паступова стала вяртацца і ўнутранае аздабленне храма. З Германіі ў дар сюды прывезлі лаўкі. А ў мінулым годзе быў набыты арган, які яшчэ больш абудзіў жыццё лютэранскай грамады.

Цяпер тут рэгулярна праходзяць канцэрты арганнай музыкі. У ліпені ўпершыню быў праведзены першы міжнародны фестываль арганнай і камернай музыкі. Плануецца, што ён стане штогадовым. Было вельмі нечакана, заўважае пастар, што шмат музыкаў з розных краін самі пажадалі паўдзельнічаць у ім.

Арганныя канцэрты ў гарадзенскай кірсе ладзяцца ледзь не кожную суботу. З іх раскладам можна азнаёміцца на сайце luther.by. Часам гучыць не арган, а, напрыклад, віяланчэль і скрыпка, фартэпіяна. У хуткім часе чакаюць выканаўцаў з Францыі, Данііі, Германіі і Фінляндыі.

Пастар заўважае, што на іх канцэрты прыходзіць вельмі шмат моладзі. Можна ўбачыць нават прадстаўнікоў нефармальных плыняў (панкаў, готаў), якіх на звычайных канцэртах класічнай музыкі наўрад ці сустрэнеш. Прыходзіць шмат дзяцей, маладых сем'яў.

У кірсе выдатная акустыка. Перайзыходзіць яе ў гэтым толькі Каложская царква, у сценах якой замураваны галаснікі.

### «Працаваць па наканаванні»

На нядзельныя службы ў кірху рэгулярна прыходзіць каля 60 прыхаджан. Часта з'яўляюцца новыя людзі. На пытанне, як у такім маладым узросце стаў пастарам, Уладзімір Татарнікаў адказвае, што кожны чалавек павінен ісці працаваць па наканаванні. Важна, каб падабалася тое, чым займаешся. А калі гэта яшчэ і карысць прыносіць, увогуле выдатна. Пастар, напрыклад, ганарыцца тым, што пры ім адбылася рэстаўрацыя кірхі, бо гэта быў няпросты працэс дыялогу са спонсарамі.

Уладзімір Татарнікаў нарадзіўся ў Вілейцы, скончыў школу ў Віцебску, потым паступіў у тэалагічную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу, адкуль быў накіраваны пастарам у Гродна. Адукаваных лютэранскіх святароў не хапае, адзначае ён. Да прыходу Уладзіміра гродзенская лютэранская грамада развівалася сама па сабе, не маючы таго, хто б яе ўзначаліў.

### Касцёл, царква, сінагога і кірха...

Можна марыць пра тое, што адной-чы і полацкая, і брэсцкая кірхі адродзяцца. Малады пастар кажа:

— Вопыт паказвае, што будынкі павінны выкарыстоўвацца па сваім непасрэдным прызначэнні. Калі гэта храм, у ім не могуць размяшчацца фірмы ці музей. Для музеяў трэба будаваць свае будынкі. А храмы створаны для таго, каб у іх ладзіць малітвы, праводзіць набажэнствы. Тое ж і з арганам. Калі ён выкарыстоўваецца ў філармоніі, то чуецца і ўспрымаецца зусім іначай, чым бы гэта адбывалася ў царкве, бо яго прызначэнне — быць інструментам для храма. Тое ж і са звонам: калі яго выкарыстоўваць на якой-небудзь гарадской вежы, эфект будзе зусім іншым. Я лічу, гэта справа часу — вяртанне будынкаў кірхаў тым абшчынам, якія ёсць у іх гарадах (а яны там дзейнічаюць, толькі ў іншых памяшканнях). Ёсць людзі, якія цікавяцца лютэранствам і маюць карані ў традыцыйным пратэстантызме... Мы ганарымся тым, што мірна жывём у краіне, дзе суіснуюць розныя канфесіі. У Гродне на невялікай адлегласці дзейнічаюць касцёл, царква, сінагога і кірха — і няма падзелаў на прыватныя тэрыторыі. Трэба адраджаць, узнаўляць, захоўваць нашы каштоўнасці. І мы ганарымся тым, што занялі сваё годнае месца ў Гродне, у культурным і духоўным плане.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*Гродзенскі раён*

■ Спадчына ў законе

## БІЗНЕС-ПЛАН ДЛЯ ГІСТАРЫЧНАГА МСЦІСЛАВА

